Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

14 СНЕЖНЯ 2006 г.
ЧАЦВЕР
№ 266 (25855)

Кошт 310 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

ДА ЧЫТАЧА!

Газета павінна не толькі прыходзіць, але і... прыязджаць

На календары — апошнія тыдні састарэлага (раптам!) года. У рэдакцыйнай пошце — адпаведна — першыя віншаванні: з Калядамі і з надыходзячым Новым... Пажаданняў шмат. Харошых. Але ж для нас, звяздоўцаў, ці не даражэй за іх вось гэта: «Родную газету, на роднай мове» я выпісваю 56 гадоў і буду выпісваць пакуль буду жыць, — прызнаецца інвалід Вялікай Айчыннай Міхаіл Аляксандравіч Аніскавец з Брагіна, «Звязду» чытаю з вялікай любоўю, — піша былы франтавік Мікалай Міхайлавіч Дыдышка з в. Ліпск Ляхавіцкага раёна, — і больш за 50 гадоў».

Яшчэ большым, у тым ліку і даваенным сяброўствам з адзінай, штодзённай беларускамоўнай ганарыцца Лідзія Андрэеўна Казак з Заслаўя, крыху меншым (толькі паўвекавым (!) Аліна Эдуардаўна Якубовіч з в. Струбніца Мастоўскага раёна, сп. Пушкін з мястэчка Лапічы...

Дарэчы, з яго ж канверта «балючае» пытанне: кожны раз, паведамляе падпісчык, дасылаю карткі на розыгрыш прызоў, а вось не выйграваў — ні разу. Нават дзірку ад абаранка. Чаму?

Гэтае чытацкае пытанне мы рашылі... завезці... нашым жа чытачам, тым, прынамсі, каму ў мінулым розыгрышы пашчасціла больш.

Такім чынам, у пятніцу, 15 снежня, Дзень падпісчыка «Звязды» адбудзецца ў Доме культуры в. Рагозніца Мастоўскага раёна, дзе, мусіць, зачакаўся свайго 2-камернага «Атланта» Іван Вікенцьевіч Новік. Пачатак сустрэчы ў 12 гадзін. Бліжэй да 16-ці маленькі звяздоўскі дэсант прыбудзе ў Ляхавічы. Там, у актавай зале райвыканкама будзе ўручаны каляровы «Віцязь» Тамары Іванаўне Козел. Апроч гэтага ў праграме сустрэч знаёмствы, расказы пра газету і яе калектыў, прэзентацыя кнігі Валянціны Доўнар «Праз каханне» і фотаальбома Анатоля Клешчука (у сааўтарстве...) «Чарнобыль», віктарына і розыгрыш прызоў драбнейшых, байкі са скарбонкі народнага гумару...

Так што прыходзьце!

Валянціна ДОЎНАР, Інга МІНДАЛЁВА, Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ.

Беларусь не дапусціць абвальнага росту цэн на нафтапрадукты

Беларусь не дапусціць абвальнага росту цэн на нафтапрадукты ў сувязі з увядзеннем Расіяй пошлін на пастаўку нафты ў нашу краіну. Такую думку выказваюць беларускія эксперты, каментуючы пастанову расійскага ўрада аб увядзенні з 1 студзеня 2007 года вывазной пошліны на нафту для Беларусі ў памеры $180,7 за тону. Цяпер сырая нафта ў Беларусь пастаўляецца на перапрацоўку бяспошлінна.

На думку экспертаў, рэзкага скачка цэн на нафтапрадукты для спажыўцоў на ўнутраным рынку можна пазбегнуць шляхам зніжэння ставак акцызаў на гэту прадукцыю. Цяпер у Беларусі доля акцызаў у цане нафтапрадуктаў складае 30—40 працэнтаў. Акрамя таго, унутраныя падаткі на нафтапрадукты ў Беларусі ў 6—10 разоў большыя за экспартныя. Таму ўзровень унутраных рознічных цэн на нафтапрадукты ў рэспубліцы складае каля 50 працэнтаў ад узроўню цэн Еўрасаюза, ён блізкі да ўзроўню цэн ЗША і адпавядае ўнутраным рознічным цэнам у Расіі.

Расійскія дэпутаты заклапочаны ўвядзеннем Расіяй пошлін на нафту для Беларусі

Шэраг дэпутатаў Дзярждумы Расіі выказалі заклапочанасць у сувязі з увядзеннем расійскім бокам экспартных пошлін на нафту, якая пастаўляецца ў Беларусь. Тэкст адпаведнай пастановы, прынятай 6 снежня ўрадам Расіі, агучыў у Маскве на пасяджэнні сесіі Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі дэпутат Дзярждумы Мікалай Кандраценка.

«Мне здаецца, што ва ўрада Расіі прысутнічае вялікае жаданне падставіць нагу беларусам», — сказаў ён, ацэньваючы гэты дакумент.

«Мне сорамна і балюча прысутнічаць на нашых сумесных мерапрыемствах і глядзець беларусам у вочы», — сказаў Мікалай Кандраценка. Адказваючы на выказванні расійскіх парламентарыяў, спікер Дзярждумы Расіі Барыс Грызлоў адзначыў, што пастанова ўрада Расіі выйшла напярэдадні пасяджэння Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы. Ён выказаў упэўненасць, што гэта тэма будзе ўзнята на маючым адбыцца пасяджэнні ВДС, якое намечана на 15 снежня.

БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

З мёдам не прападзеш

Жыхарка Глуска Алена МАЛАШУК — пчаляр з 15-гадовым стажам. У яе хатняй гаспадарцы — мёд самых розных гатункаў.

У Беларусі ў 2007 годзе плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 4,7 млн кв.м жылля

У Беларусі ў 2007 годзе ў адпаведнасці з прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны павінна быць уведзена ў эксплуатацыю 4,2—4,7 млн кв.м агульнай плошчы жылля. Аб гэтым паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Віктар Бура на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. Прайшло яно пад старшынствам прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага.

«Вопыт гэтага года паказвае, што толькі верхняя планка прагнозу рэальна стымулюе рэгіёны», — адзначыў Віктар Бура. У сувязі з гэтым ён прапанаваў давесці планавае заданне па будаўніцтву жылля на будучы год па максімуму.

Як праінфармаваў Віктар Бура, плануецца, што для грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у 2007 годзе будзе пабудаваны 71 працэнт ад агульнага аб'ёму ўводу жылля. У 2007 годзе ў рэспубліцы прадугледжана забяспечыць жыллём сацыяльнага карыстання 868 сем'яў, яшчэ 546 сем'яў будзе адселена са старых і аварыйных дамоў. Акрамя таго, жыллём будуць забяспечаны 1694 шматдзетныя сям'і.

У сельскай мясцовасці і малых гарадскіх паселішчах у будучым годзе плануецца ўвесці ў эксплуатацыю больш як 1,4 млн кв.м жылля, або каля 31 працэнта ад агульнага аб'ёму ўводу. У сельскагаспадарчых арганізацыях намечана пабудаваць 8135 дамоў (кватэр), у тым ліку ў аграгарадках 1247 дамоў.

На фінансаванне жыллёвага будаўніцтва з усіх крыніц у 2007 годзе з улікам затрат на інжынерную і транспартную інфраструктуру плануецца накіраваць 4,2 трлн рублёў. Асноўнымі крыніцамі будуць крэдытныя рэсурсы банкаў, сродкі насельніцтва, сродкі кансалідаванага бюджэту, а таксама сродкі арганізацый.

Вольга СРЭДНЕВА, БЕЛТА.

Павышэнне цаны на газ не прывядзе да значнага росту кошту будаўніцтва жылля

Павышэнне цаны на газ, які пастаўляецца ў Беларусь, не прывядзе да значнага росту кошту будаўніцтва жылля, заявіў журналістам міністр архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр Селязнёў.

«Калі газ будзе пастаўляцца ў 2007 годзе па цане на 15 працэнтаў вышэйшай, чым у гэтым годзе, як мы спадзяёмся, то гэта практычна не паўплывае на кошт квадратнага метра», — пераканаў міністр. Так, паводле яго даных, кошт самага энергаёмістага будматэрыялу — цэменту — пры павышэнні цаны на газ на 15 працэнтаў узрасце на 2—3 працэнты. «У сувязі з тым, што ў кошце квадратнага метра цэмент займае ўсяго 5 працэнтаў, гэта прыметна не паўплывае на цану жылля», — сказаў Аляксандр Селязнёў.

Нават «у выпадку форс-мажорных сітуацый» з цаной на газ, дадаў ён, на ўзроўні ўрада можа быць прыняты шэраг рашэнняў, якія прадухіляць істотнае павелічэнне цэн на будаўніцтва жылля.

Аляксандр Селязнёў паведаміў, што па даручэнню кіраўніка дзяржавы ўжо зроблены і ўнесены ў Савет Міністраў разлікі, якія паказваюць, што прынятых у краіне нарматыўна-прававых актаў на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, урада і ведамстваў дастаткова для таго, каб пры адсутнасці форс-мажорных абставін трымаць цану на панэльнае жыллё, што будуецца з дзяржаўнай падтрымкай, у рэгіёнах — на ўзроўні $380 за 1 кв.м і на ўзроўні $420—450 за 1 кв.м у Мінску.

Міністр нагадаў таксама, што ў адпаведнасці з указам прэзідэнта да 2010 года ў рэспубліцы да 80 працэнтаў агульнага аб'ёму ўводу жылля будзе будавацца для грамадзян, якія стаяць у чарзе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Вольга СРЭДНЕВА, БЕЛТА.

САЦЫЯЛЬНЫЯ СТАНДАРТЫ НА СЯЛЕ — ГЭТА ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ ВЯСКОЎЦА

Пра сацыяльную палітыку мясцовых органаў улады, работу па ўкараненню сацыяльных стандартаў у вёсцы наша сённяшняя гутарка з намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама Леанідам ЦУПРЫКАМ.

— Прэзідэнт краіны, урад патрабуюць ад улады на месцах работы, вынікам якой будзе адчуванне чалавека, што яму жывецца камфортна, што пра яго клапоціцца, не пакідаюць адзін на адзін з праблемамі. Наколькі, на ваш погляд, ахова здароўя ў вёсцы адпавядае раней пастаўленым задачам?

— Калі гаварыць строга, даступнасць аказання спецыялізаванай медыцынскай дапамогі сельскаму насельніцтву забяспечваецца перш за ўсё міжраённымі профільнымі аддзяленнямі ў стацыянарах Брэста, Баранавічаў і Пінска, а таксама дыягнастычнымі і лячэбнымі магчымасцямі абласных устаноў аховы здароўя. Пры наяўнасці паказанняў пацыент можа быць накіраваны ва ўказаныя ўстановы, а таксама ў рэспубліканскія навукова-практычныя медыцынскія цэнтры.

Але бліжэй за ўсё да вяскоўца, вядома ж, урач агульнай практыкі сельскай амбулаторыі. Такіх амбулаторый у вобласці больш за палову: 75 з 114. На пачатак года не было дактароў у адзінацыі сельскіх установах аховы здароўя. Зараз — вакансіі толькі ў чатырох. Гэта пытанне плануем вырашыць да жніўня наступнага года. Зазначу, што ўсе ўрачы, якія прыехалі на працу ў вёску сёлета, забяспечаны жыллём.

З пачатку гэтага года аснашчана медыцынскім абсталяваннем 25 урачэбных амбулаторый. Рамонт, рэканструкцыя, паляпшэнне вядуцца паўсюдна. Вось толькі прыклады за апошнія 11 месяцаў: праведзена рэканструкцыя Кукаўскага ФАПа і Кругавіцкай амбулаторыі Ганцавіцкага раёна, зроблены капітальны рамонт Пескаўскай і Малецкай амбулаторый Бярозаўскага, Тамашоўскай — Брэсцкага, Шаняўскага ФАПа Пружанскага раёнаў, Цярэбліцкай амбулаторыі Столінскага, Вялікарыцкай і Олтускай участковых бальніц Маларыцкага раёнаў. Адрамантаваны Русіноўскі ФАП Баранавіцкага, Моладаўская і Опальская амбулаторыі Іванаўскага, Астроміцкі ФАП Кобрынскага, Русінавіцкі ФАП Ляхавіцкага, Лунінская і Любчанская амбулаторыі Лунінецкага, Малоткавіцкая амбулаторыя і Аснежыцкі ФАП Пінскага раёнаў. Працягваюцца работы па рэканструкцыі Пелішчанскай участковай бальніцы Камянецкага, рамонту Дастоеўскага ФАПа Іванаўскага, Беражкоўскай участковай бальніцы Столінскага раёнаў і іншых.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ІНФЛЯЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ Ў СТУДЗЕНІ—ЛІСТАПАДЗЕ СКЛАЛА 5,7 ПРАЦЭНТА

У Беларусі індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў лістападзе 2006 года склаў 101,8 працэнта да кастрычніка. У параўнанні са снежнем 2005 года цэны ў лістападзе павялічыліся на 5,7 працэнта, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу. Нагадаем, што ў адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2006 год гадавая інфляцыя запланавана на ўзроўні 7—9 працэнтаў.

Каментарый аб парадку індэксацыі даходаў насельніцтва Беларусі за лістапад 2006 года

Заработная плата дзяржаўных служачых, грашовае забеспячэнне ваеннаслужачых (акрамя ваеннаслужачых тэрміновай службы) і асоб радавога і начальніцкага складу за лістапад 2006 года індэксуюцца на 5,7 працэнта. Як паведаміла карэспандэнту БЕЛТА першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Алена Колас, гэта тлумачыцца тым, што індэкс спажывецкіх цэн за лістапад гэтага года перасягнуў пяціпрацэнтны парог да снежня мінулага года і склаў 105,7 працэнта.

Нагадаем, індэксацыя ажыццяўляецца па нарматыву, устаноўленаму Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2006 года № 55 «Аб нарматыве індэксацыі грашовых даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі». Індэксуецца даход у межах Br165 тыс. 790 — 100 працэнтаў зацверджанага бюджэту пражытачнага мінімуму, дзеючага на момант індэксацыі. Частка даходу, якая перавышае гэту суму, індэксацыі не падлягае.

Паколькі індэкс спажывецкіх цэн за лістапад да студзеня гэтага года не перасягнуў пяціпрацэнтны парог, мінімальная заработная плата за лістапад 2006 года не індэксуецца і складае Br156 тыс. 900.

ДЭМАГРАФІЧНЫ «МІНУС» МЕНШАЕ?

З пачатку года ў Беларусі адзначана пэўнае змяншэнне адмоўнага натуральнага дэмаграфічнага сальда. За сёлетнія студзень—кастрычнік у параўнанні з аналагічным перыядам летась сярэдні па краіне паказчык нараджальнасці павялічыўся прыкладна на 6,3, а паказчык смяротнасці — знізіўся на 2,1 працэнта.

У прыватнасці, як сведчыць статыстыка, за студзень—кастрычнік гэтага года ў краіне нарадзілася 79 838 чалавек, і ў тым ліку 12 886 чалавек — на Брэстчыне (за аналагічны перыяд летась гэты паказчык па рэгіёну складаў 12 404), 9342 чалавекі — на Віцебшчыне (летась — 8816), 12 171 — на Гомельшчыне (11 652), 9322 — на Гродзеншчыне (8391), 12 181 — на Міншчыне (11 332), 9202 — на Магілёўшчыне (8728) і 14 734 чалавекі — у Мінску (13 788). Адначасова пайшлі з жыцця 115 212 жыхароў Беларусі. Так, за студзень—кастрычнік сёлета на Брэстчыне было зарэгістравана 16 215 выпадкаў смяротнасці (за такі ж час летась — 16 952), Віцебшчыне — 17 343 (17 522), Гомельшчыне — 18 438 (18 301), Гродзеншчыне — 14 358 (15 032), Міншчыне — 19 763 (20 379), Магілёўшчыне — 14 986 (15 320), а ў сталіцы — 14 109 (14 155).

Самы высокі ўзровень нараджальнасці сёлета адзначаецца ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — 10,7 і 10 выпадкаў на кожную тысячу жыхароў рэгіёнаў. Найбольш жа нізкі ўзровень смяротнасці (9,5 выпадкі на тысячу) захоўваўся ў сталіцы.

Сяргей ГРЫБ.

НОВЫ ГОД У СТАЛІЦЫ: ШТО, ДЗЕ, КАЛІ

Да Новага года сталіца падрыхтавалася, мінчане і госці горада застануцца задаволенымі. Такога ніколі не было — святочныя і канцэртныя мерапрыемствы будуць праведзены адразу на 160 пляцоўках горада. Пачнецца святкаванне 2007-га традыцыйна 23 снежня з вялікага кірмашу на праспекце Пераможцаў.

ПАРАД ДЗЕДАЎ МАРОЗАЎ СТАНЕ САМЫМ БУЙНЫМ

На галоўную ёлку краіны дзеці будуць запрошаны ў Палац Рэспублікі 27 снежня. Сярод іншых мерапрыемстваў, якія кожны год праводзяцца ў час Калядаў і Новага года, можна вызначыць уручэнне спецыяльнай прэміі Прэзідэнта краіны за духоўнае адраджэнне (урачыстасць адбудзецца 7 студзеня гэтаксама ў Палацы Рэспублікі) і трэці па ліку калядны турнір па хакею на прызы Прэзідэнта Беларусі, які пройдзе з 3 па 7 студзеня.

Упершыню святочныя канцэрты пройдуць і на новай пляцоўцы перад Нацыянальнай бібліятэкай. А ўвогуле, у кожным раёне сталіцы вялікія гулянні будуць арганізаваны як мінімум у трох месцах. І гэта толькі на асноўных кропках:

— Праводзіць навагоднія канцэрты, гулянні запланавана як мага бліжэй да жылых мікрараёнаў сталіцы. Гэта датычыцца буйных мерапрыемстваў, на якія звычайна прыходзяць паглядзець, узяць удзел і проста цікава правесці час шмат людзей. На Кастрычніцкай плошчы і на праспекце Пераможцаў, як было і раней, з'явіцца лядовы каток. Але ў навагоднюю ноч, для таго, каб людзі не хадзілі па лёдзе, канцэртная праграма ў цэнтры горада не прадугледжана. Замест яе пройдуць выступленні фігурыстаў, спартсменаў пад музыку. Так зручней для мінчан, — расказаў **намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама Анатоль САБІТАЎ**. — Разам з тым кожны сталічны раён падрыхтаваў новую, цікавую праграму.

У цэнтры ж сталіцы, як і заўсёды, будзе наладжана ўрачыстае шэсце Дзядоў Марозаў і Снягурак. У гэтым годзе іх будзе больш: сто казачных вестуноў свята, да шэсця якіх далучацца яшчэ перапрануты народныя героі.

— Яскравую навагоднюю «дэлегацыю» ўзначаліць галоўны Дзед Мароз. Трыццатага снежня а палове адзінаццатай шэсце пачнецца ад Палаца спорту і завершыцца каля Палаца Рэспублікі. Па камандзе галоўнага Дзеда Мароза навагодняя ёлка запаліць свае агеньчыкі, і Новы год пачне рухацца да нас! Галоўны Дзед расчыніць вялікі мех з падарункамі, а асістэнты Дзяды Марозы разкрыюць іх дзецям, — апісаў пачатак відовішча Анатоль Сабітаў.

І, канешне ж, галоўны навагодні салют узнімецца ў неба ў Навагоднюю ноч з 31 снежня на 1 студзеня. Адбудзецца гэта а палове другой. Чакаецца, што феерверк пройдзе пад музычнае суправаджэнне.

Усе вулічныя святкаванні непасрэдна ў святочную ноч працягнуцца да чатырох гадзін раніцы. Сталічны транспарт таксама будзе працаваць у спецыяльным рэжыме, каб усе жадаючыя змаглі даехаць да свайго дома у навагоднюю ноч без цяжкасцяў.

ЁЛАЧНЫЯ КІРМАШЫ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ БЕЗ ВЫХАДНЫХ З 10 ДА 19 ГАДЗІН

Паводле слоў начальніка аддзела гандлю і грамадскага харчавання ўпраўлення спажывецкага рынка Мінгарвыканкама Таццяны Касцюк, з 23 па 31 снежня працуюць ёлачныя кірмашы. Усяго ў 150 месцах сталіцы можна будзе набыць лясную прыгажуню. Графік працы кірмашоў — з 10 гадзін раніцы да 19 гадзін вечара, без перапынкаў і выхадных.

Самы ж вялікі навагодні кірмаш 23 снежня на праспекце Пераможцаў будзе гандляваць ёлачнымі ўпрыгажэннямі, прысмакамі да святочнага стала, маскарадным ўборамі. Святочнае аздабленне вітрын і гандлёвых памяшканняў завершана. У крамах, гіпермаркетах, універмагах прадугледжаны навагоднія і калядныя скідкі на тавары.

— Рэкламных акцый, прэзентацый тавараў праводзіцца шмат, таму спажывец у перадсвяточны перыяд можа набыць некаторую прадукцыю танней, — расказала Таццяна Касцюк. — Гандлёвыя кропкі прапануюць усю лінію спецыяльных навагодніх тавараў — касцюмы Дзеда Мароза і Снягуркі, дзіцячае маскараднае адзенне. А вось петарды і іншая піратэхніка, падкрэслю, забаронены для продажу і выкарыстання ўвогуле.

Арыгінальныя кулінарныя вырабы кандытарскіх фабрык з сімваламі надыходзячага года, выраблены з натуральных ягад і садавіны, у апошні тыдзень перад святам запоўняць паліцы гандлёвых кропак. Прадуктаў для святочнага стала гандлёвая сетка назапасіла на любы густ. Выставы продаж ў дэманстрацыі і дэгустацыі праводзіць амаль кожнае прадпрыемства — не толькі магазін, але і харчовыя кропкі. Навагоднія падарункі камплектуе па заяўках устаноў кожнае прадпрыемства гандлю.

РЭСТАРАНЫ АДЧЫНЕНЫ ДА РАНІЦЫ

Згодна з графікам паставак, 2 мільёны 128 тысяч бутэлек шампанскага было прадугледжана прадаць за апошнія чатыры месяцы. На сённяшні момант 1 мільён 600 тысяч бутэлек атрымана. Таму галоўным святочным напоем мінчане будуць забяспечаны. Дарэчы, правілы продажу алкагольнай прадукцыі ў навагоднюю ноч зменены не будуць.

Як паведаміла Таццяна Касцюк, у апошні дзень года харчовыя гандлёвыя прадпрыемствы кшталту гастраномаў будуць працаваць да 21 гадзіны. Універсамы і буйныя крамы, дзе ганлююць прадуктамі, зачыняцца ў 23 гадзіны. Гандлёвыя кропкі, якія спецыялізуюцца на продажы спажывецкіх тавараў, будуць працаваць да 20.00, універмагі і буйныя ўніверсальныя магазіны — да дзевяці гадзін вечара. Рынкі сталіцы будуць працаваць па звычайнаму графіку.

— Усе кафэ і рэстараны, у якіх праводзіцца святкаванне Новага года, з 15 снежня па 1 студзеня зачыняцца у шэсць гадзін раніцы, — сказала спецыяліст. — Ужо зараз складзена святочнае меню для наведвальнікаў. З 22 снежня па 6 студзеня ў кропках харчавання будуць праводзіцца дэгустацыя і выстава-продаж прысмакаў.

Дарэчы, у Мінску налічваецца каля 1,5 тысячы аб'ектаў грамадскага харчавання, якія могуць прыняць 116 тысяч наведвальнікаў. Сярод усіх гэтых кропак — 700 рэстаранаў і кафэ. Ужо зараз для правядзення святочных вечарын забраніравана больш за 95 працэнтаў месцаў. Таму тым, хто жадае адзначыць свята у рэстаране, застаўся літаральна адзін дзень для заказу месца.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЗАТРЫМАНЫЯ ДВОЕ ЗЛАЧЫНЦАЎ, ШТО «НАСЛЯДЗІЛІ» Ў БЕЛАРУСІ...

Беларускімі праваахоўнікамі праведзена вялікая работа па пошуку членаў банды нахабнікаў, якія больш за год таму на тэрыторыі Добрушскага раёна ўчынілі ўзброены напад на работнікаў ААТ «Гомельскі горнаабагачальны камбінат» і завалодалі 109 мільёнамі рублёў. Як паведамілі карэспандэнту нашай газеты ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гомельскага аблвыканкама, у выніку сумесных намаганняў нашых аператыўнікаў і іх расійскіх калег ужо затрыманы двое злачынцаў, што «наслядзілі» тады на тэрыторыі Беларусі.

Нагадаем, што летась шасцёра крымінальнікаў у масках паблізу вёскі Леніна літаральна атакавалі УАЗ камбіната, у якім з банка везлі грошы на выплату зарплаты работнікам таварыства. Два аўтамабілі «Жыгулі» блакіравалі дарогу, па якой ехала машына камбіната. Зрабіўшы некалькі стрэлаў з аўтамата Калашнікава і паляўнічага ружжа па капоту УАЗа, злачынцы напалі на касіра і завалодалі 109 мільёнамі рублёў. Вадзіцель, а таксама двое ўзброеных паляўнічымі ружжамі работнікаў камбіната, што суправаджалі касіра, не змаглі аказаць ніякага супраціўлення — настолькі нечаканым і дзёрзкім быў напад. Акрамя грошай, злачынцы захапілі і ружжо ТОЗ аднаго з ахоўнікаў, пасля чаго зніклі ў бок расійскай мяжы. Нягледзячы на аператыўнасць, з якой дзейнічалі беларускія праваахоўнікі пасля паступлення трывожнага сігналу аб абрабаванні, затрымаць тады па гарачых слядах крымінальнікаў не ўдалося. На тэрыторыі Расіі быў толькі знойдзены адзін з аўтамабіляў, што кінулі злачынцы. І вось год пошукаў, якія не спыняліся, даў плён: пры пераходзе расійска-ўкраінскай мяжы былі затрыманы двое грамадзян Украіны, у якіх пры вобыску расійскія пагранічнікі знайшлі аўтамат і помпавае ружжо. Як высветлілася, менавіта гэта зброя выкарыстоўвалася пры нападзе на УАЗ. Зараз вырашаецца пытанне аб экстрадыцыі гэтых злачынцаў у Беларусь. Паводле папярэдняй інфармацыі, астатнія ўдзельнікі злачыннай групы — расійскія грамадзяне. Большасць са злачынцаў згаданай групоўкі былі раней судзімымі.

Ігар ГРЫШЫН.

УКЛАДЫ БЕЛАРУСАЎ ПАВЯЛІЧЫЛІСЯ БОЛЬШ ЯК НА 2 ТРЛН РУБЛЁЎ

За 11 месяцаў рублёвыя і ўклады ў замежнай валюце насельніцтва ў беларускіх банках у перапразліку на нацыянальную валюту павялічыліся больш як на 2 трыльёны рублёў, або на 38,4 працэнта, паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Нацыянальнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.

За студзень—лістапад гэтага года дэпазіты грамадзян у нацыянальнай валюце ўзраслі на 1,6 трыльёна рублёў (на 44,7 працэнта), а ў замежнай — на 231,3 мільёна долараў ЗША (на 26,8 працэнта). Такім чынам на пачатак снежня ўклады фізічных асоб у нацыянальнай валюце дасягнулі каля 5,3 трыльёна рублёў, а ў замежнай — амаль 1,1 мільярда долараў. Як падкрэсліваюць спецыялісты галоўнага банка краіны, нягледзячы на змяншэнне стаўкі рэфінансавання з 1 снежня да 10 працэнтаў гадавых, узровень працэнтных ставак па ўкладах у беларускіх рублях па-ранейшаму перакрывае як тэмпы інфляцыі, так і даходнасць па зберажэннях у СКВ.

Ігар ГРЫШЫН.

«ЗАПАСЛІВАЯ» БАБУЛЬКА

У гаспадарчых пабудовах вясковай пенсіянеркі знойдзена... 13 990 000 пагонных метраў тканіны імпартнай вытворчасці.

Паводле інфармацыі прэс-службы УУС Брэсцкага аблвыканкама, супрацоўнікі падраздзялення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі і ўпраўлення ўласнай бяспекі выйшлі на «сховішча» тканіны ў ходзе аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў. У вёсцы Прыборава ў 70-гадовай бабулькі захоўвалася вышэйзгаданага тавару на агульную суму каля 300 мільёнаў рублёў. А вось дакументаў, якія я б пацвярджалі легальнасць увозу на тэрыторыю рэспублікі тканіны, не знайшлося. У выніку тавар канфіскаваны, а па факту праводзіцца праверка.

Ігар ГРЫШЫН.

АДКАЗНАЯ АСОБА «ЭКАНОМІЛА» ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ

Падчас «прамой лініі», якую ў Гомельскай вобласці праводзіў старшыня Камітэта дзяржкантролю Беларусі, жыхарка Рэчыцы па тэлефоне паведаміла пра тое, што, маўляў, адна з адказных асоб ААТ СП «Рэчыцапіва» на сваім прысядзібным участку выкрадае электраэнергію, змяніўшы схемы ўключэння трохфазнага лічыльніка.

«Сігнал», як высветлілася пасля праверкі Камітэта дзяржкантролю па Гомельскай вобласці, узнік не на пустым месцы — факты пацвердзіліся. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-цэнтры Камітэта дзяржкантролю, па выніках праверкі ў адносінах да «эканомнай» асобы прыменены штрафныя санкцыі ў памеры 3,5 мільёна рублёў. Акрамя таго, па прадстаўленню Камітэта дзяржкантролю прадпрыемства разарвала кантракт з гэтым адказным работнікам.

Ігар ГРЫШЫН.

ПАЛІЎНЫЯ ГРАНУЛЫ — ПРАДУКТ ЗАПАТРАБАВАНЫ

Фота БЕЛТА.

Максімальную карысць з другаснай сыравіны атрымліваюць на ААТ «Барысаўскі ДАК». На камбінаце арганізавана практычна безадходная вытворчасць прадукцыі дрэваапрацоўкі — драўнянавалакністых пліт, піламатэрыялаў, клеенага бруса. У ход найперш ідуць традыцыйныя апілкі, з якіх вырабляюць дастаткова новую для Беларусі прадукцыю — паліўныя гранулы, або пелеты.

Поўнасцю ўтылізуюцца таксама адходы драўніны — кара, адсеў, галінкі, кавалкі драўніны, якія не падлягаюць перапрацоўцы. Яны спальваюцца ў двух магутных катлах, што дазваляе ДАКу адмовіцца ад прыроднага газу ў якасці энганосьбіту і забяспечваць цеплавой энергіяй не толькі вытворчыя памяшканні прадпрыемства, але і ўвесь тэхналагічны працэс. Штомесячна ДАК выпускае каля 500 т паліўных драўняных гранул. Яны ўяўляюць сабой прадукт прасавання сухіх апілак і з'яўляюцца экалагічным і дастаткова эканамічным відам паліва. Па цеплатворнасці пелеты не саступаюць вугалю, а прадукты іх згарання практычна адсутнічаюць. Аднак гэта вытворчасць на прадпрыемстве арыентавана пераважна на экспарт — у Латвію, Італію, Данію, Германію. Пастаўкі ж на ўнутраны рынак пакуль адзінкавыя. Разам з тым пелетамі можна эфектыўна ацяпляць дамы, розныя (у тым ліку вытворчыя) памяшканні, пасажырскія вагоны, выкарыстоўваць у печах і камінах, кацельнях і нават на ЦЭЦ, што ва ўмовах росту цэн на іншыя віды паліва, безумоўна, павысіць зацікаўленасць у іх выкарыстанні ў рэспубліцы.

БЕЛТА.

ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

З **60-годдзем** шчыра віншуем начальніка Мастоўскага вузла паштовай сувязі **Івана Серафімавіча УЛАНОВІЧА!**

Жадаем
быць заўжды багатым,
Багатым — шчасцем і спакоем,
Здароўем, радасцю ў сям'і,
Сябрамі вернымі, любоўю,
І ўсім прыгожым на зямлі!

Звяздоўцы.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.12.2006 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 140,00
1 еўра	2 836,46
1 латвійскі лат	4 070,38
1 літоўскі літ	821,51
1 чэшская крона	101,62
1 польскі злоты	746,40
1 расійскі рубель	81,58
1 украінская грыўня	424,81

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	26,2332
10 UAH	51,9274
1000 BYR	12,2506
EUR	34,8115

Курс у гандлёвых кампаніях (на 13.12.2006)

USD	2200 / 2310

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2006 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Супрацоўніцтва

Апошні бар'ер для кантрабандыстаў

Беларускія мытнікі перакрылі шэраг каналаў незаконнага ўвозу ў Расію тавараў і вывазу з РФ прадметаў гісторыка-культурнай спадчыны

Спрытныя кантрабандысты спрабуюць у сваіх мэтах выкарыстаць «празрыстасць» беларуска-расійскай мяжы.

Як паведаміў падчас сустрэчы з беларускімі і расійскімі журналістамі начальнік упраўлення арганізацыі барацьбы з кантрабандай і адміністрацыйнымі мытнымі правапарушэннямі Дзяржаўнага мытнага камітэта (ДМК) Беларусі Андрэй Міхалькевіч, наша краіна з'яўляецца своеасаблівым буферам на шляху кантрабандных тавараў у Расію, а таксама з тэрыторыі РФ. Сёлета толькі падчас адной сумеснай аперацыі «Невад» мытныя службы абедзвюх краін канфіскавалі кантрабанды на суму больш за 1 мільён долараў. Таксама былі перакрытыя каналы паставак у РФ праз Беларусь партыі адзення на 400 тысяч долараў, партыі футра — на 500 тысяч долараў і абутку — на 1,5 мільёна долараў. Беларускія мытнікі спынілі вываз 66 тысяч прадметаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць. Большая частка гэтай «выратаванай спадчыны» — расійская.

Сумесныя намаганні беларускіх і расійскіх мытнікаў па барацьбе з кантрабандай і «шэрым» імпартам былі б яшчэ больш эфектыўнымі, калі б Федэральная мытная служба РФ загадзя па электроннай пошце паведамляла калегам аб перамяшчаемых таварах. Нашы мытнікі ўжо ўкаранілі такую сістэму і могуць аператыўна прасачыць за перамяшчэннем грузаў, каб яны «не згубіліся» на тэрыторыі Беларусі ці Расіі. Да таго ж гэтая сістэма дае магчымасць эканоміць час перавозчыкаў. Напрыклад, беларуская «фура» афармляецца на мяжы не больш за 15 хвілін, а расійская — не менш чым 40.

Вядома ж, падчас сустрэчы журналісты не абмінулі гандлёвыя праблемы, якія ўзніклі паміж абедзвюма краінамі летам гэтага года. Маюцца на ўвазе перашкоды экспарту беларускага цукру ў Расію, а таксама кантроль, які наладзіла наша мытня на мяжы з РФ, каб спыніць пастаўкі кантрафактных кандытарскіх вырабаў. Паводле слоў Андрэя Міхалькевіча, масавых затрыманняў падробленых кандытарскіх вырабаў пакуль не было. Усяго выяўлена і канфіскавана 5 партый агульнай вагой 25 тон. Прычым не ўвесь салодкі кантрафакт быў з Расіі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Пытальнік

ПРОСТА ВЯРНУЦЬ ЧЭКІ БУДЗЕ НАШМАТ ПРАСЦЕЙ І ЛЯГЧЭЙ

Я ўклаў свае чэкі «Маёмасць» у Першы інвестыцыйны фонд. Зараз хачу іх вярнуць, каб перавесці ў чэкі «Жыллё», паколькі мая дачка хоча пагасіць імі крэдыт на пакупку кватэры. Ці магчыма іх зараз вярнуць, якая там працэдура? Паведаміце, калі ласка, адрас Першага інвестыцыйнага фонду? Адказ апублікуйце ў газеце.

М.С. Новік,
п/а Міжлессе Бярозаўскага раёна

Як мы паведамлялі раней, у перыяд абарачэння чэкаў «Маёмасць» грамадзяне, якія мелі права на вяртанне памянёных каштоўных папер пры ліквідацыі спецыялізаваных інвестыцыйных фондаў, што акумулявалі імянныя прыватызацыйныя чэкі «Маёмасць», але не атрымалі іх у перыяд працы ліквідацыйных камісій, могуць звярнуцца з пытаннем аб вяртанні чэкаў «Маёмасць» у інспекцыі па каштоўных паперах па месцы знаходжанні ліквідаваных спецыялізаваных інвестыцыйных фондаў (СІФаў). Па СІФу «ПРІФ» (Першы інвестфонд) трэба звяртацца ў Мінскую гарадскую інспекцыю Камітэта па каштоўных паперах пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (220002 г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44). Як удакладніў нам яе начальнік Віктар Амельяновіч, пры звароце грамадзянін па-ранейшаму павінен прадставіць наступныя дакументы: дакумент, які сведчыць асобу (у выпадку асабістага звароту) або ксеракопію пашпарта (стар. 22, стар. 31—33); заяву аб вяртанні чэкаў «Маёмасць» з указаннем даных (прозвішча, імя, імя па бацьку, паштовы адрас, колькасць чэкаў, нумар спецыяльнага (чэкавага) рахунка; адзін з дакументаў, якія пацвярджаюць валоданне акцыямі (дагавор куплі акцый СІФа, пасведчанне акцыянера, сертыфікат акцый); двухбаковую ксеракопію сертыфіката чэкаў «Маёмасць».

Як заўважыў Віктар Амельяновіч, магчымы зварот грамадзян як па пісьмовай заяве, так і асабіста — калі, напрыклад, як у нашым выпадку, чалавеку трэба вярнуць чэкі тэрмінова. Але ў справе нашага канкрэтнага заяўніка не ўсё так проста, як падаецца на першы погляд. Нават калі ён звернецца ў інспекцыю асабіста, пакуль будуць зацверджаны адпаведныя спісы, пройдзе нейкі час. Але галоўнае не гэта. Як вынікае з ліста чытача, ён збіраецца перавесці чэкі «Маёмасць» у чэкі «Жыллё». А нядаўна мы пісалі (і гэта яшчэ раз пацвердзіў Віктар Мікалаевіч): зрабіць гэта амаль немагчыма (паколькі імянныя прыватызацыйныя чэкі ўжо ўкладваліся ў Першы інвестфонд). Тэарэтычна, канешне, шанц ёсць, паколькі такія рашэнні прымаюцца мясцовымі выканкамамі — раптам заяўніку пашанцуе? Але і гэта не ўсё. Нават калі выканкам прыме станоўчае рашэнне, на гэта спатрэбіцца час, а чэкі «Жыллё» павінны быць перарэгістраваны да 1 студзеня 2007 года. Ці здолее выканаць усе гэтыя працэдуры чытач, калі ўлічыць, колькі часу засталося да пачатку наступнага года? Але, паўторымся, усё вышэйсказанае датычыцца толькі магчымай спробы заяўніка не толькі вярнуць чэкі «Маёмасць», але і перавесці іх у чэкі «Жыллё». Калі ж грамадзянін проста пажадае вярнуць чэкі «Маёмасць», пытанне тэрміну так востра для яго стаяць не будзе.

ДЗЯЎЧЫНА З НАШАЙ АКОЛІЦЫ

*Спецыяліст аддзела продажу 3-га мінскага малаказавода **Наталля БАХНО** і вядомы брэнд, які выпрабляецца на гэтым прадпрыемстве, — малако і кефір «Аколіца».*

ФАЛЬШЫЎКІ «ПРЫХОДЗЯЦЬ» З-ЗА МЯЖЫ...

У Беларусі, дзякуючы намаганням праваахоўнікаў, у гэтым годзе ўдалося знізіць колькасць фактаў збыту падробнай замежнай валюты. Паводле даных упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, за 10 месяцаў такіх фактаў зафіксавана на трэць менш, чым летась.

Прычым у асноўным падобныя фальшыўкі ўвозяцца ў краіну з-за мяжы. Так, з Расіі ўвезена каля 70 працэнтаў выяўленых падробак, з Польшчы і Украіны — па 10 працэнтаў. У васьмі выпадках у якасці збытчыкаў несапраўдных грошай на тэрыторыі рэспублікі фігуравалі ўкраінскія грамадзяне, у 35 — расійскія. Напрыклад, у Мінску былі затрыманы раней судзімыя грамадзяне Літвы, Украіны і сталічны жыхар, у якіх канфіскаваны 5 падробных купюр па 500 еўра і дзве — па 5000 расійскіх рублёў. Дарэчы, гэтыя дзялкі таксама мелі дачыненне да збыту аналагічных фальшывак на тэрыторыі Украіны.

Ігар ГРЫШЫН.

«РЭЙКАВАЯ ВАЙНА»

Сёлета ў Беларусі пад колы цягнікоў трапілі 324 чалавекі.

Як паведаміў «Звяздзе» часова выконваючы абавязкі начальніка аддзела аховы правапарадку ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце Аляксандр Жылінскі, для 169 чалавек сутыкненне з цягніком скончылася «лятальным выходам». Адметна, што кожная чацвёртая ахвяра «рэйкавай вайны» была ў нецвярозым стане.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

КАМП'ЮТАРЫЗАВАНЫ СТУДЭНТ

Амаль на 114 мільёнаў рублёў камп'ютарнай тэхнікі канфіскавана ў 20-гадовага студэнта аднаго з універсітэтаў, якую ён перавозіў у мікрааўтобусе «Фольксваген».

Машыну, якой кіраваў юнак, для праверкі спынілі праваахоўнікі на дарозе Брэст—Мінск паблізу вёскі Звёзднае Баранавіцкага раёна. Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама, на груз студэнт не меў суправаджальных дакументаў. А таму тавар і аўтамабіль канфіскаваны.

Ігар ГРЫШЫН.

НЕ ЎТРЫМАЛАСЯ

У суд Бярозаўскага раёна пракуратура накіравала крымінальную справу на мясцовага ўрача-тэрапеўта.

Жанчына за грошы выдавала бальнічныя лісты здаровым пацыентам. Цяпер яе абвінавачваюць у атрыманні хабару і ў службовым падлогу.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

САЦЫЯЛЬНЫЯ СТАНДАРТЫ НА СЯЛЕ — ГЭТА ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ ВЯСКОЎЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Варта сказаць і пра бальніцы сястрынскага догляду. Іх у вобласці 11, і ў трох раёнах адкрыты адпаведныя аддзяленні пры ўчастковых бальніцах. Часта такая ўстанова — адзінае выйсце для адзінокіх састарэлых людзей. Тут ім забяспечаны догляд і медыцынская дапамога.

А ўсяго ў вобласці зараз працуе 41 участковая, гэта значыць сельская, бальніца. Дык вось на рамонт і рэканструкцыю ўсіх сельскіх устаноў аховы здароўя пайшло сёлета 3923 мільёны рублёў. Добрая іх работа сёння немагчымая без адпаведнага транспартнага забеспячэння. За 11 месяцаў года азначаныя ўстановы атрымалі 48 адзінак новага санітарнага транспарту.

Асобны клопат органаў кіравання аховы здароўя і органаў улады ў цэлым — аперацыйныя блокі і рэанімацыйныя аддзяленні раённых бальніц. Аперацыйныя і рэанімацыйныя аддзяленні Бярозаўскай, Драгічынскай, Камянецкай, Кобрынскай ЦРБ здадзеныя ў эксплуатацыю. Практычна завершаны работы па рэканструкцыі аперацыйнага блока Баранавіцкай гарадской бальніцы, рамонту рэанімацыйнага аддзялення Пінскай гарадской бальніцы. Вядзецца рэканструкцыя і абнаўленне аперацыйных і рэанімацый у Ганцавічах, Жабінцы, Іванаве, Століне, Івацэвічах, Ляхавічах.

— Радзеюць вёскі, закрываюцца сельскія школы. Ад гэтага, на жаль, нікуды не дзенешся. Наколькі даступная якасная адукацыя вясковаму школьніку вобласці?

— Сёння размову весці пра варыятыўнае, рознаўзроўневае, профільнае навучанне, у тым ліку па індывідуальных вучэбных планах, можна не толькі на прыкладзе гарадскіх, але і сельскіх школ. У вобласці зараз працуюць 24 гімназіі і 7 ліцэяў. З іх чатыры раённыя, дзе навучаюцца дзеці з сельскай мясцовасці. Тры гады таму быў адкрыты Брэсцкі дзяржаўны абласны агульнаадукацыйны ліцэй імя П. Машэрава для адораных вучняў з раёнаў. Зараз 75 працэнтаў дзяцей у ім — вясковыя школьнікі, якія забяспечаны жыллём і харчаваннем за кошт абласнога бюджэту. Да новага навучальнага года адкрыўся раённы ліцэй у Жабінцы, у якім дзеці з вёскі таксама могуць атрымаць якасную адукацыю. Працуюць установы такога кшталту ў Івацэвічах і Лунінцы. Пры іх маюцца інтэрнаты, а значыць, і ўмовы для навучання вясковых дзяцей.

У сельскай школе, нават у самай глыбінцы, ёсць умовы для паўнацэннай адукацыі. Прыкладам таму можа служыць работа калектыву Кругавіцкай школы Ганцавіцкага раёна. Сёлета выпускнік гэтай школы Яўген Віктаровіч на цэнтралізаваным тэсціраванні набраў па матэматыцы 89 балаў, па фізіцы — 83 балы са 100. 11 выпускнікоў Кругавіцкай школы паспяхова прайшлі цэнтралізаванае тэсціраванне па ўсіх прадметах. Лічбы гавораць за тое, што ў школе пад кіраўніцтвам Аляксандра Занько вучні атрымліваюць такія ж грунтоўныя веды, як і іх гарадскія равеснікі ва ўстановах з паглыбленым вывучэннем прадметаў.

На жаль, даводзіцца штогод закрываць або рэарганізоўваць 10—15 вясковых школ у сувязі з малой колькасцю іх вучняў. Але ёсць у гэтым працэсе і станоўчы момант. Больш сродкаў можна выкарыстаць на паляпшэнне матэрыяльнай базы, абсталяванне школ у буйных населеных пунктах, што таксама спрыяе паляпшэнню якасці навучання. Пытанні падвозу дзяцей з аддаленых вёсак практычна вырашаныя. Вось і сёлета быў закуплены 41 аўтобус. За апошнія некалькі гадоў значна палепшыўся ўзровень аснашчанасці сельскіх школ камп'ютарнай тэхнікай, сучаснымі сродкамі навучання, вучэбнай і метадычнай літаратурай.

Распачатая ў рэспубліцы падрыхтоўка настаўнікаў па здвоеных спецыяльнасцях дазваляе не толькі забяспечыць дадатковыя сацыяльныя гарантыі сельскім педагогам, вырашыць праблему іх поўнай вучэбнай нагрузкі, але і працуе на паляпшэнне ўсё той жа якасці навучальнага працэсу. Нікто, пэўна, не будзе спрачацца са сцвярджэннем, што ёсць розніца паміж тым, калі прадмет выкладае спецыяліст і выпадковы настаўнік, якога «дагрузілі» гадзінамі. На мой погляд, школа сёння дае магчымасць тым юным вяскоўцам, якія імкнуцца да ведаў, атрымаць якасную адукацыю.

— Адлюстраваннем адной з сацыяльных бед грамадства служаць адкрытыя ў кожным раёне прытулкі для дзяцей. Як у цяперашніх умовах напоўніць канкрэтным зместам Дэкрэт Прэзідэнта Беларусі «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у няўдалых сем'ях»? Хто на месцах будзе працаваць з няўдалай сям'ёй?

— Не толькі бяда, але і галоўная загана нашага грамадства — п'янства. Менавіта п'янства параджае нябачаную ў ранейшыя часы з'яву, якая атрымала назву сацыяльнае сіроцтва. Зараз у вобласці больш за тры тысячы сірот, яшчэ 3220 дзяцей з 1627 сем'яў знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным стане. Для такіх дзяцей працуюць дзесяць школ-інтэрнатаў, створана 16 сацыяльных прытулкаў. У населеных пунктах работу з няўдалай сям'ёй вядуць сацыяльна-псіхалагічныя службы ўстаноў адукацыі разам з органамі апекі і папячыцельства, установамі аховы здароўя, камісіямі па справах непаўналетніх. Але названыя ўстановы, так бы мовіць, закліканы абараніць дзяцей, а не ацверазіць бацькоў.

Надзею на апошняе мы якраз і звязваем з уступленнем у дзеянне названага Дэкрэта. Па рашэнню судоў вобласці амаль паўтары тысячы нядбайных бацькоў павінны вярнуць дзяржаве больш за мільярд рублёў за выхаванне і догляд дзяцей. Спагнана пакуль толькі 200 мільёнаў рублёў. Але пачатак «ацверажэнню» многіх бацькоў усё-такі пакладзены. Думаю, чым больш рашучыя і жорсткія меры ў адносінах да гэтых людзей будуць прынятыя, тым больш будзе карысці. Усе мы даўно ўпэўніліся, што ўгаворы, тлумачэнні, культурна-асветніцкая работа на пэўны кантынгент суграмадзян не дзейнічае.

У названым накірунку работы акрэслены, але гэта не значыць, што ў цэлым выхаваўчая, культурная работа з сям'ёй можа аслабнуць. Ставіцца задача нават у самай маленькай вёсачцы працаваць з людзьмі так, каб падкрэсліваць значнасць сям'і, умацоўваць яе пазіцыі. На кожным сваце вёскі, на кожным мерапрыемстве, арганізаваным установамі культуры, гэтай тэматыцы надаецца асаблівае значэнне.

— Дарэчы, пра ўстановы культуры. Многія з іх апошнім часам сталі дамамі сацыяльных паслуг у вёсцы. Наколькі яны ўпісаліся ў новыя рэаліі жыцця?

— Добра ўпісаліся. Яны сталі культурнымі ўстановамі новага тыпу. Зараз у вобласці на месцы былых клубаў, дамоў культуры створаны 31 дом сацыяльна-культурных паслуг. Такія ўстановы працуюць у невялікіх вёсках, дзе пражывае менш за сто чалавек, а часам і два—тры дзесяткі жыхароў. І гэтыя былыя ачагі культуры сталі асноўным цэнтрам, што звязваюць вёску, вобразна кажучы, з вялікім светам. Сюды па графіку прыязджае доктар, тут прымаюць заказы на бытавыя паслугі, у гэтай зале вяскоўцы сустракаюцца з удзельнікамі раённай або іншых інфармацыйных груп. Тут, як правіла, захаваліся бібліятэкі, сюды прыходзяць пажылыя людзі як у своеасаблівы клуб па інтарэсах. Можна наведаць Перасудавіцкі Дом сацыяльных паслуг Бярозаўскага раёна, завітаць у Рагозна Брэсцкага раёна, Крышылавічы Ганцавіцкага, Агдэмер Драгічынскага, Баранцы Жабінкаўскага раёнаў і ўпэўніцца, як нефармальна, цікава наладжана работа падобных устаноў. У некаторых з іх створаны музеі, пастаянна дзеючыя выставы, працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

А я думаю так...

НЕ ЛЯЦІЦЕ, ЧАПЛІ, НА СЯЛЕЦ

Шмат пісалася пра адстрэл чапляў і бакланаў у рыбгасе «Сялец». Групы паляўнічых страляюць гэтых птушак тысячамі. Асабліва шкада чапляў, бо гэтая птушка не такая шкодная, як думаецца адміністрацыі рыбгаса. Хто бачыў, як гадзінамі стаіць чапля на беразе, каб злавіць тую рыбку, здзівіцца, што птушкі з'ядаюць аж 50 тон таварнай рыбы ў год і гэтым быццам бы наносяць гаспадарцы вялікія страты. Колькасць вылаўленай чаплямі рыбы ўстанавілі спецыялісты ў сталіцы. Відавочна, яны карысталіся нейкімі сваімі выкладкамі і разлічылі, колькі неабходна птушцы ў дзень рыбін. А тое, зловіць чапля карпа ці не, да ўвагі не бралася. Норму ёй выдзелілі ў кабінеце і перамножылі на прыблізную колькасць птушак, і атрымаліся тоны. Чаплі — пералётныя птушкі і пры міграцыі са Скандынавіі не ведаюць, што на возеры Сялец ім нельга адпачываць. Тут за кожную чаплю плацяць 3100 рублёў, а за забітага баклана — удвая больш. Акрамя гэтага, на адну птушку выдаюць па тры патроны. Сёлета ўжо застрэлілі амаль 1600 чапляў і каля тысячы бакланаў.

У асноўным адстрэльваюць шэрую чаплю, але калі на мушку трапляе белая, якая ахоўваецца, то, былі выпадкі, забівалі і яе. Адным словам, тысячы і тысячы чапляў паклалі свае галовы на возеры Сялец і наўкол яго.

Безумоўна, страты рыбы значна завышанья, а калі ўлічыць усе выдаткі на адстрэл птушак, не кажучы ўжо пра нанесены ўрон прыродзе, то прыбытку рыбгас ад гэтай аперацыі не атрымае. Чалавек зноў вырашае, каму з фауны жыць, а каму не. Па якому праву?

Нам добра вядомы факт масавага знішчэння вераб'ёў, якія, быццам бы пакінулі вялікую краіну без хлеба. Вынік той кампаніі быў сумны — хлеба не дабавілася, а шкоднікаў развялося.

І чамусьці шведы чапляў не страляюць і не баяцца, што гэтыя птушкі зробяць іх беднымі.

Патэлефанаваў у рыбгас і пачуў рэзкае: «Стралялі і страляць будзем, бо маем на гэта права!»

А чаму б не падлічыць, колькі тон таварнай рыбы штогод «бяруць» на возеры браканьеры? Можа, іх лепш «адстрэльваць», г.зн. лавіць?

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимого имущества: **Лот № 1:** трехэтажное здание вспомогательных помещений пл. 1739 кв.м.: Молодечненский район, д. Красное. Начальная цена — 842 676 000 бел. руб. **Лот № 2:** пристройка корпуса № 6 пл. 352,9 кв.м: г. Молодечно, ул. В. Гастинец, 67. Начальная цена — 41 556 000 бел. руб. **Лот № 3:** здание конторы — 2-этажное кирпичное здание пл. 281 кв.м: г. Молодечно, ул. Лебедевская, 8. Начальная цена — 47 974 000 бел. руб. **Лот № 4:** здание станции технического обслуживания автомобилей пл. 2760 кв.м, г. Молодечно, ул. Лебедевская, 8. Начальная цена — 414 306 000 бел. руб. Начальные цены снижены на 20%. Оплата за объекты должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 01 сентября 2006 г. № 193. Аукцион состоится 28 декабря 2006 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 27 декабря 2006 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов: **Лот № 1:** корпус № 17 «а» (литейный), трехэтажное кирпичное здание, пл. 2402,1 кв.м: г. Молодечно, В. Гостинец, 67. Начальная цена – 338 317 000 бел. руб. **Лот № 2:** незавершенное строительством капитальное строение (3-этажное кирпичное здание, пристройка к корпусу № 17 «а», готовность 87%), пл. 1598,4 кв.м: г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67. Начальная цена – 794 626 000 бел. руб. Размер задатка по каждому лоту составляет 10% от начальной цены и перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «Белпромстройбанк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объекты продаются без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома на основании заявления победителя аукциона. Оплата за объекты должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 28 декабря 2006 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 27 декабря 2006 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.

Згублены **дыплом В-1 № 073693,** выдадзены Беларускім дзяржаўным інстытутам народнай гаспадаркі імя Кірава на імя **Любчэўскай Марыі Барысаўны,** лічыць **несапраўдным**.

Открытое акционерное общество «Белорусская валютно-фондовая биржа»

СООБЩАЕТ

о проведении внеочередного Общего собрания акционеров, которое состоится 28 декабря 2006 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 48-а.

Регистрация участников — с 15.30 до 15.55.

Предполагаемая повестка дня:

1. Об утверждении сметы текущих расходов и капитальных вложений ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» на 2007 год.

При себе необходимо иметь паспорт и документ, подтверждающий полномочия на участие в собрании.

Телефон для справок: 206-34-64.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов в составе: незавершенное строительством административно-бытовое здание, вагон-рефрижератор (об. пл.45 кв.м, объем 100 м³), гараж (об. пл. 432 кв.м), здание кормокухни (об. пл.432 кв.м), котел-парообразователь (объем 11,9 м³), оленники (пл. 13,2 га и пл. 17,1 га), незавершенный строительством зерносклад, расположенные по адресу: Молодечненский район, п. Чисть, ул. Парковая, 7. Начальная цена снижена на 20% и составляет 567 320 000 белорусских рублей. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.09.2006 г. Аукцион состоится 28 декабря 2006 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 27 декабря 2006 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства здания сборочного цеха пл. 4083,0 кв.м, расположенного по адресу: г. Молодечно, ул. Замковая, 19. Начальная цена — 1 142 992 000 белорусских рублей. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.09.2006 г. № 213. Аукцион состоится 28 декабря 2006 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 27 декабря 2006 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимого имущества: цех шпал пл. 235 кв.м, лесоцех пл. 845 кв.м, по адресу: Логойский район, г.п. Плещеницы. Начальная цена снижена на 10% и составляет — 71 375 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.09.2006 г. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 28 декабря 2006 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 27 декабря 2006 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимого имущества:

Лот № 1: здание арматурного цеха пл. 2031,8 кв.м, начальная цена — 547 280 000 бел.руб., г. Молодечно, ул. Рабочая, 8. **Лот № 2:** здание гаражей кирпичных пл. 234,6 кв.м, здание склада из профнастила пл. 242,5 кв.м, здание кирпичного склада пл. 53,8 кв.м, 126 032 000 руб., г. Молодечно, ул. Молодежная, 10. **Лот № 3:** здание свинарника: д. Поповщина, 166 344 000 руб. **Лот № 4:** здание свинарника с навесом: д. Поповщина, 190 540 000 руб. **Лот № 5:** здание участка пластмасс, пл. 186,5 кв.м, 53 480 000 руб., г. Молодечно, ул. Замковая, 19. **Лот № 6:** здание комплексного приемного пункта, пл. 158,2 кв.м, 26 480 000 руб., д. Носилово, ул. Гастелло. **Лот № 7:** здание овощехранилища, пл. 838,8 кв.м, 85 197 000 руб., д. Красное, ул. Советская, 1. **Лот № 8:** малярный цех, расположенный в здании велосипедного цеха, пл. 350,0 кв.м, что составляет 24,2 доли велосипедного цеха, 105 250 000 руб., г. Молодечно, ул. Промышленная, 4. **Лот № 9:** здание конторы пл. 420,0 кв.м, 79 944 000 руб., г. Молодечно, ул. Великосельская. **Лот № 10:** здание навеса, пл. 1089,2 кв.м, 47 873 000 руб., д. Красное, ул. Советская, 1. **Лот № 11:** здание склада № 2, пл. 145,8 кв.м, 10 248 000 руб., д. Красное, ул. Советская, 1. **Лот № 12:** здание производственно-складского корпуса пл. 1194,4 кв.м, 332 330 000 руб., г. Молодечно, ул. Элеваторная, 3. **Лот № 13:** здание склада пл. 348 кв.м, 55 380 000 бел. руб., Молодечненский район, д. Поповщина. Оплата за объекты должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.11.2006 г. Аукцион состоится 28 декабря 2006 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 27 декабря 2006 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства объекта незавершенного строительства (без консервации) в составе: административное здание, производственный корпус молочного завода, по адресу: г. Смолевичи, ул. Социалистическая, 54. Начальная цена снижена на 10% и составляет — 1 494 465 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 03.10.2006 г. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 28 декабря 2006 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 27 декабря 2006 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ

совместного открытого акционерного общества «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум — наша косметика»

26 декабря 2006 года в 9 часов 30 минут во вспомогательном корпусе СОАО «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум — наша косметика», расположенного по адресу: город Минск, улица Володько, 6, состоится внеочередное собрание акционеров.

Повестка дня внеочередного собрания акционеров:

1. Решение вопроса о предоставлении безвозмездной спонсорской помощи.
2. Переоценка основных средств.

Начало регистрации акционеров в 9 часов 00 минут.

При себе иметь документ, удостоверяющий личность.

Наблюдательный совет СОАО «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум — наша косметика»

Героі спартыўнага года

Заслужаны майстар спорту Дзмітрый ДАШЧЫНСКІ:

«АДЧУВАЮ ЗА САБОЙ РАДЗІМУ...»

...Тую тэлевізійную «карцінку» з алімпійскага Турына-2006 убачыў увесь шматмільённы спартыўны свет. Сотні ж тысяч аматараў спорту з Беларусі запомнілі яе надоўга, а можа, і на ўсё жыццё... Калі ў вячэрняе італьянскае неба высока ўзляцеў беларускі фрыстайліст Дзмітрый Дашчынскі і пачаў «вырабляць» там неверагодныя піруэты і кульбіты, а праз імгненне паспяхова прызямліўся і ўпэўнена ўтрымаўся на нагах, непадалёк ад трампліна прама ў снег паваліўся чалавек у спартыўным касцюме з надпісам на спіне — «Belarus». Што здарылася? Наўрад ці зразумеў, хто гэта... А ў тым чалавеку толькі нямногія — родныя і сябры-трэнеры, знаёмыя ды кіраўнікі беларускага спорту — пазналі Мікалая Іванавіча Казеку — першага і адзінага настаўніка спартсмена...

«Што ж здарылася?» — пазней, пасля вяртання беларускіх алімпійцаў з Турына ў Мінск, мы паўторна задалі гэта пытанне Мікалаю Іванавічу. Сціплы і абаяльны чалавек, таленавіты педагог-выхавальнік, некалькі засароміўшыся, адказаў: «Паддаўся эмоцыям. Ды і перахваляваўся я вельмі моцна...»

Усяго некалькі слоў. За імі ж — гады і дзесяцігоддзі сумеснай працы настаўніка і вучня, ледзь ці не штодзённых (а іншым разам — і па дзве-тры) трэніровак, напружанага і такога адказнага жыцця ў вялікім спорце!

...Адукацыю ў пачатковай школе і засваенне азоў скачкоў на батуце Дзіма Дашчынскі пачаў, па сутнасці, адначасова. Балазе, у гэтым відзе спорту працаваў бацька, так што пытанне: «Куды пайсці і чым заняцца?» перад хлапчуком ледзь ці не з пялёнак, так бы мовіць, і не паўставала...

Аднак (на шчасце ці не, гэта адназначна «вызначыць» зусім немагчыма) у жыццё наогул, і ў вялікі спорт — у прыватнасці вельмі і вельмі часта «ўрываецца» яго Вялікасць выпадак. Тады, у сямідзесятыя—васьмідзесятыя гады, у Беларусі надзвычай імклівы тэмп развіцця пачаў «набіраць» новы від спорту — фрыстайл. Першымі з ім, вядома ж, зблізіліся і «зразумелі» яго трэнеры па скачках на батуце Мікалай Казека і Уладзімір Дашчынскі, і ўжо пачынаючы з 1988 года ў фрыстайл прыйшлі адразу тры аматары і фанаты: бацька і сын Дашчынскія і Мікалай Казека...

Канкрэтызую для аматараў статыстыкі: на календары быў 1988 год!

Міне яшчэ дзесяцігоддзе. Дзіму Дашчынскаму «ўжо» 21 гадок, за ягонай спінай будуць перамогі на чэмпіянатах Беларусі і асобных міжнародных турнірах і спаборніцтвах, званне майстра спорту... А ў далёкім, такім таямнічым і загадкавым японскім горадзе Нагана зусім маладога беларускага фрыстайліста будзе чакаць першае, неверагоднай адказнасці выпрабаванне: XVIII зімовыя Алімпійскія гульні.

Ужо тады для Дзмітрыя сакрэтаў і нейкіх там «таямніц» у фрыстайле практычна не было. І Мікалай Іванавіч Казека, і Уладзімір Іванавіч Дашчынскі, авалодаўшы лепшай на той час сусветнай методыкай і практыкай наладжвання вучэбна-выхаваўчага працэсу, трэніровачнага і аднаўляльнага цыклаў, здолелі (ці не ў гэтым і заключаецца талент сапраўдных трэнераў-педагогаў?!) спланаваць і паставіць справу так, што з іх вучнем, у большасці сваёй завочна, сапернікі пачыналі лічыцца як з адным з асноўных прэтэндэнтаў на алімпійскія ўзнагароды. Удакладнім: не столькі самі тыя сапернікі, колькі іх настаўнікі, так званыя спартыўныя разведчыкі і эксперты...

Алімпіяда-1998 у Нагана стала для Дзмітрыя Дашчынскага выпрабавальнай ва ўсіх без выключэння адносінах. Па-першае, перад самым стартам яе, падчас заняткаў на батуце, «не вытрымала» нагрузкі адна са спружын і ...стрэліла спартсмену прама ў галаву. Шпіталь, швы, забарона трэніровак... Калі ж беларуская каманда прыбыла ў Японію, на Дзіму звалілася яшчэ адна навала: ён прастудзіўся.

Ні неспрыяльныя ўмовы падрыхтоўкі да Алімпіяды, ні высокая тэмпература непасрэдна падчас выступленняў у Нагана не перашкодзілі яму прадэманстраваць свае здольнасці і навыкі, на поўны голас заявіць аб сабе, у прамым сэнсе слова ўварвацца ў эліту сусветнага фрыстайла... Сканцэнтраваўшы волю і сабраўшы ў кулак сілы, спаўна аддаўшыся барацьбе, Дашчынскі выканаў трайное сальта з чатырма вінтамі — скачок з разраду ультра-сі на той час, што ўрэшце і прывяло яго на трэцюю, «бронзавую» прыступку п'едэстала гонару XVIII Алімпійскіх гульняў 1998 года.

На шматлікіх этапах розыгрышаў Кубка свету сезонаў 1998—2001 гадоў, чэмпіянаце свету—2001 Дзмітрый Дашчынскі нязменна выходзіў у фіналы, перыядычна атрымліваючы сярэбраныя медалі. Выйграў буйны міжнародны турнір у ЗША... Аднак галоўным арыенцірам, вядома ж, заставалася Алімпіяда 2002 года ў Солт-Лэйк-Сіці.

Фота БЕЛТА.

За некалькі дзён да алімпійскага старту Дзіма выйграў адну залатую і дзве сярэбраныя ўзнагароды на этапах Кубка свету. Гэта найперш засведчыла: спартсмен у добрай спартыўнай форме. І раптам... На адной з трэніровак у канадскім горадзе Блэкомбе ён няўдала прызямліўся і зламаў ключыцу. У Ванкуверскім медыцынскім цэнтры 31 студзеня 2002 года Дашчынскаму зрабілі аперацыю — імплантавалі пласцінку для фіксацыі ключыцы. Урачы, трэнеры і спецыялісты настойвалі, каб ён адмовіўся ад выступлення на Гульнях. Аднак усяго праз два тыдні беларускі спартсмен выйшаў на старт. На жаль, да траўмы, на якую сам Дзіма зусім не звяртаў увагі, дабавіліся іншыя фактары: вялікі вецер падчас выканання ім практыкавання, ды і суддзі яўна недаацанілі яго выступленне... У выніку мужны атлет, выйшаўшы ў фінальную частку спаборніцтваў, апынуўся толькі на сёмым месцы.

Турын-2006 «наблізіўся» даволі хутка. Да трэцяй у сваім спартыўным жыцці Алімпіяды Дзмітрый Дашчынскі рыхтаваўся з яшчэ большай сур'ёзнасцю і адказнасцю, чым да ранейшых стартаў. І ён сам, і спецыялісты (найперш, вядома ж, галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Мікалай Казека і настаўнік маладзёжнай каманды Уладзімір Дашчынскі) выдатна ўсведамлялі, што ад Дзімы ўсе чакаюць толькі залатой узнагароды.

Галоўнымі сапернікамі нашага спартсмена з'яўляліся амерыканец Джарэт Петэрсан, Хан Сяо Пен з Кітая і расійскі фрыстайліст Уладзімір Лебедзь. Пасля першай спробы лідарства захапіў мінчанін — 131,42 ачка: амерыканец адстаў на 6,5 ачка, а кітаец усяго толькі на 0,89. Усё павінен быў вырашыць другі скачок...

Трайное сальта з чатырма вінтамі пры каэфіцыенце 4,425 павінна было пакінуць яго ў лідарах. Аднак... Зусім невялікая недакладнасць падчас прызямлення плюс ранейшая прадузятасць суддзяў «перамясцілі» Дзіму на другое, «сярэбранае» месца. «Золата» служыцелі Феміды аддалі Хан Сяо Пену, «бронзу» — Уладзіміру Лебедзю.

Гэта была адзіная ўзнагарода, завяваная беларускімі спартсменамі на XX Алімпійскіх гульнях у Турыне.

...Нямногім атлетам свету спартыўны лёс наканаваў выступленні на трох Алімпійскіх гульнях запар. Дзмітрый Дашчынскі — адзін з іх. Наогул жа ён адзіны фрыстайліст у свеце, які мае ўзнагароды, завяваныя на дзвюх Алімпіядах. Аднак трэба ведаць характар Дзімы: ён не спыняецца на дасягнутым. «Калі дазволяць сілы і здароўе, — сказаў ён пасля вяртання з Турынскай Алімпіяды, — прыму ўдзел і ў Гульнях-2010 года ў Ванкуверы... Я займаюся любімай справай, адчуваю за сабой Радзіму — значыць, трэба апраўдваць надзеі і спадзяванні беларусаў...»

Што тут можна дадаць да слоў сапраўднага героя спорту?!

Анатоль МЯСНІКОЎ.

Сенсацыя!

НОВЫ ГОД УЖО НАСТУПІЎ!

Што прынясе нам тройца — Свіння, Юпітэр і Стралец?

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 13 снежня.)

Якім абяцае стаць для чалавецтва новы 2007 год мы папрасілі расказаць астролага Кацярыну Флікоп.

— Вы сказалі, што ў новым годзе ў некаторых можа развіцца «зорная хвароба». Значыць, для гэтага будуць падставы?

— Натуральна. Асабліва ўдалым, паводле прагнозаў, Год Свінні будзе для прадпрымальнікаў і бізнэсменаў, для спецыялістаў у сферы рэкламы, для палітыкаў, прапаведнікаў, журналістаў і ўвогуле людзей творчых. Аднак адразу хачу папярэдзіць, што нават у самым спрыяльным годзе заўсёды ёсць перыяды, небяспечныя для пэўных спраў і пачынанняў. Напрыклад, з **14 лютага па 8 сакавіка** і з **16 чэрвеня па 9 ліпеня** нам давядзецца перажыць перыяды рэтраграднага Меркурыя. Гэтая планета адказвае за зносіны і сродкі камунікацыі. У азначаныя перыяды верагодны зрывы запланаваных сустрэч, здзелак і дзелавых перамоў, парушэнні ў рабоце транспарту, аргтэхнікі, сродкаў мабільнай і электроннай сувязі. Лепш не прызначаць на гэты час адказных бізнэс-сустрэч, не ўладкоўвацца на працу, пачакаць з падпісаннем кантрактаў, дагавораў і любых юрыдычных дакументаў, вельмі ўважліва правяраць і пераправяраць усю атрыманую інфармацыю. Не будзе надзейнай набытая ў гэты перыяд бытавая тэхніка. Аднак азначаныя перыяды спрыяльныя для падрыхтоўчай працы (збору інфармацыі, рабоце ў архіве і г.д.)

З **6 красавіка па 6 жніўня** нас будзе выпрабоўваць рэтраградны Юпітэр. Праяўляцца яго ўплыў можа дваяка: альбо замаруджваннем у справах, альбо наадварот — залішняй экспансіяй. Чалавек можа рэальна «збіцца з курса» на 4 месяцы, пераацаніць свае магчымасці. У гэты час варта быць вельмі асцярожным ва ўчынках, праяўляць сціпласць, усе дзелавыя справы праводзіць «закулісна».

Яшчэ адзін даволі напружаны перыяд, пра які варта ўзгадаць, гэта перыяд рэтраграднай Венеры **(27 ліпеня — 8 верасня)**. Асабістае жыццё і яго праблемы ў гэты час выйдуць на першы план, аднак цяжка будзе спакойна прыняць няўдачы і непаразуменне з боку блізкага чалавека, а яны вельмі верагодныя напрыканцы будучага лета. Магчымыя сустрэчы з людзьмі з мінулага, з якімі некалі былі рамантычныя адносіны. Гэта добры час для расстаўлення кропак над «і». Некаторыя з нас на гэты час увогуле замкнуцца ў сабе, каб абараніцца ад праблем асабістага жыцця.

— Вы агучылі станоўчыя тэндэнцыі і напружаныя моманты Года Свінні ў цэлым. А што ён прынясе кожнаму знаку Задыяка ў прыватнасці?

— Для **Авенаў** год будзе паспяховым. Многія іх справы і задумы будуць рэалізоўвацца лёгка і хутка, асабліва ў сацыяльным і прафесійным плане. Галоўнае — дзейнічаць прадумана і не ісці на неапраўданую рызыку. **Цяльцы** змогуць дасягнуць поспеху не толькі сваёй упартасцю і настойлівасцю, але і ўменнем дзейнічць актыўна і шырокамаштабна. Ім трэба за паўсядзённай руцінай разглядзець новыя перспектывы. **Блізнятам** у новым годзе можа перашкодзіць залішняя рухавасць, камунікабельнасць і жаданне паспець усюды. Ваша задача — з вялікай колькасці прапаноў і ідэй выбраць самы важны і паспяховы варыянт. **Ракі** змогуць шмат чаго дасягнуць у прафесійнай сферы, калі акрэсляць гарызонты для развіцця. Абысці падводныя камяні яны здолеюць, падключыўшы інтуіцыю і ўменне выяўляць матывы дзеянняў акаляючых. Удача **Львоў** у новым годзе ўзрасце. Каб яе не страціць, варта даверыцца цячэнню жыцця, смела рэалізоўваць справы і праекты. Толькі не пераацаніце свае сілы і магчымасці. Залішняя асцярожнасць, скептыцызм і разважлівасць могуць сапсаваць **Дзевам** новы год. Гэтыя якасці не дазволяць заўважыць шырокія перспектывы для кар'ернага росту. Галоўнае для Дзеваў — актыўныя дзеянні. **Шалям** 2007 год прынясе шмат прыемных сюрпрызаў. Іх дзелавая гібкасць і спагадлівасць могуць прыцягнуць новых дзелавых партнёраў і супрацоўнікаў. Толькі не будзьце занадта даверлівымі. **Скарпіёны** змогуць развіць, пашырыць і ўмацаваць свае поспехі ў дзелавой і прафесійнай сферы, дасягнутыя летась. Зараз вам важна не паглыбляцца ў сябе, а спакойна і рашуча дзейнічаць. **Стральцы** — гэта ваш год. Удача будзе спадарожнічаць вам ва ўсім, галоўнае — не ўпусціце момант. Дзейнічайце, развівайцеся, пашырайце працоўныя гарызонты. Пастарайцеся не пераацаніць свае сілы і высветліце, каму можна давяраць. **Казярогі** ў новым годзе могуць смела ўдасканальваць сваё прафесійнае майстэрства і рабіць захады да кар'ернага росту. Не ўпусціце свой шанц. **Вадалеям** Год Свінні прынясе шмат нечаканасцяў. Будзьце гатовыя хутка адрэагаваць на спакуслівую прапанову, аднак захоўвайце цвярозы розум. Год спрыяе сацыяльнай актыўнасці і развіццю працоўных спраў. А вось **Рыбы** ў новым годзе могуць упусціць свой шчаслівы шанц з-за рассеянасці, адсутнасці дысцыпліны. Пастаўце перад сабой мэту і дзейнічайце актыўна і ўпэўнена — тады абавязкова дасягнеце поспеху.

— А што год Свінні прынясе розным знакам Усходняга календара?

— **Пацука** чакае спакойны год з паступовым развіццём спраў і магчымасцяў. Будуйце планы і смела рэалізуйце іх. Для **Быка** год вельмі перспектыўны. Яскравыя ідэі, нечаканыя рашэнні і новыя знаёмствы дапамогуць многага дасягнуць. **Тыграм** варта як след праявіць сябе і весці актыўны лад жыцця. Толькі у такім выпадку вам гарантаваны поспех. Для **Ката (Труса)** вельмі паспяховы год. Галоўнае — сувымяраць свае сілы і жаданні, рэальна ацэньваць магчымасці. У **Драконаў** будзе шмат новых магчымасцяў, толькі трэба іх разглядзець. Дапамогуць актыўнасць і ўважлівасць. **Змяі** неабходна быць больш асцярожнай пры выбары супрацоўнікаў і партнёраў. Знайдзіце тых, каму можаце давяраць, і ў вас усё атрымаецца. **Каня** чакаюць сюрпрызы, праўда, не заўсёды прыемныя. Развівайце інтуіцыю і пашырайце справы — гэта ваш шлях да поспеху. Для **Казы** год паспяховы. Шанцаванне верагодна ў самых розных галінах, таму не губляйце дарэмна час. **Малпе** неабходна будзе праявіць максімум вынаходлівасці, энергічнасці і актыўнасці, каб пераадолець магчымыя цяжкасці. **Пеўня** чакае год новых магчымасцяў і перспектыў, будзьце гатовыя да сюрпрызаў. У **Сабакі** год будзе спрыяць замацаванню дасягнутых вынікаў, а таксама ўпэўненым крокам у выбраным накірунку. **Свіння** — гэта год ваш! Удача будзе спрыяць ва ўсім, рэалізуйце свае мары. Аднак захоўвайце цвярозы розум.

Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.

Беларускі іранец, іранскі беларус

Лёсы

Бежанцы пакідаюць радзіму па розных прычынах: з-за рэлігійных, расавых, палітычных ці іншых праследаванняў, аднак трагедыя ва ўсіх адна — яны любяць сваю краіну, але не могуць жыць там, дзе нарадзіліся, выраслі, дзе ўсе іх родныя і блізкія. Яны вымушаны выехаць і жыць удалечыні ад усяго, што любяць...

— На ўсім белым свеце вы не знойдзеце ніводнага іранца, які не хацеў бы жыць на сваёй радзіме! — з жарам пераконвае мяне Амран Хасейнпур, бежанец з Ірана.

Амран — незвычайны чалавек: яго лёс амаль цалкам вызначыла літаратура, яго манеры нагадваюць пра эпоху сярэднявечнага рыцарства, ён — бежанец, які пражыў у Беларусі амаль палову свайго жыцця. Мне прыемна адзначыць, што герой гэтай газетнай публікацыі — мой калега: ён скончыў факультэт журналістыкі БДУ (нават накірунак такі ж — друкаваныя СМІ).

Малая радзіма Амрана Хасейнпура — гарадок Лахіджан (што ў паўночнай правінцыі Ірана — Гілян), які ён вымушаны быў назаўсёды пакінуць у маі 1985 года. Да гэтага прывялі падзеі, што адбыліся значна раней:

— У канцы 70-х мае аднагодкі і я былі апантанымі іранскімі школьнікамі, якія зачытваліся творамі пісьменнікаў-разначынцаў (Дабралюбава, Чарнышэўскага і інш.), Дастаеўскага, Горкага ў персідскім перакладзе, — расказвае Амран. — Нам прыйшліся даспадобы ідэі Вялікай французскай рэвалюцыі з яе лозунгам «Свабода, роўнасць, братэрства», і мы вяршылі сваю рэвалюцыю — мірную: удзельнічалі ў стачках, дэманстрацыях, памятаю, часам мы ў знак пратэсту нават адмаўляліся хадзіць у школу — баставалі.

Час ішоў. Прытрымліваючыся лева-марксісцкіх поглядаў, Амран і яго аднадумцы імкнуліся стварыць правобраз камуністычнай партыі. Зараз гэта ўжо гісторыя: змяніліся і погляды Амрана, і сітуацыя ў Іране, аднак тады існавала сур'ёзная пагроза і Амран вымушаны быў эмігрыраваць. Ахвяраваць давялося многім:

— Я адважыўся на самы крайні крок — выехаць з Ірана ў СССР. На радзіме я пакінуў бацькоў, трох братоў і чатырох сясцёр, якія не падзялялі маіх перакананняў, але любілі мяне і суперажывалі мне. Калі настаў час ад'язджаць, маме я сказаў, што адпраўляюся на заробкі ў суседні горад — баяўся яе расхваляваць і засмуціць навіной пра тое, што ад'язджаю ў СССР. Праўду ведалі толькі бацька і адзін з братоў.

Развітваючыся ў той дзень з Амранам, яго мама і не здагадвалася, што бачыць сына ў апошні раз. А ці мог ён прадбачыць тады, што больш ніколі не зможа абняць маму і зазірнуць ёй у вочы? Бацькі Амрана памерлі некалькі гадоў таму, а вось з братамі і сёстрамі ён усё яшчэ спадзяецца ўбачыцца.

Ва ўспамінах Амрана радзіма непарыўна звязана з зямлёй і рысам, які на ёй вырошчваюць:

— Я дапамагаў бацьку працаваць у нашай сямейнай краме і на палях, дзе мы вырошчвалі высокагатунковы рыс, што каштуе надзвычай дорага (нават у Іране, ды яго ў прынцыпе і не экспартуюць), бо ён высакаякасны і вырошчваецца яго няшмат (толькі ў нас у Гіляне і ў суседняй правінцыі Мазендаран). Іранцы гэты рыс абажаюць! Аналагаў яму няма нідзе ў свеце — толькі тут ёсць патрэбныя для яго кліматычныя ўмовы! Я і сёння памятаю пах таго рысу, ён такі духмяны!

На маю просьбу апісаць гэты незвычайны водар Амран адказаў так:

— О, гэта трэба нюхаць!

З усіх краін тады яшчэ Савецкага Саюза ўцяхач з Ірана выбраў менавіта Беларусь, чаму?

— Я сустракаў у літаратуры ўзгадванні пра беларусаў і ведаў, што яны вельмі пацярпелі за гады вайны, — расказвае Амран, — акрамя таго, там іх характарызавалі як народ вельмі мяккі, спагадлівы, памяркоўны ў адносінах да прадстаўнікоў розных рэлігій і нацыянальнасцяў.

Так, ва ўзросце 24 гадоў Амран Хасейнпур апынуўся ў Беларусі. Першы год яго жыцця ў нашай краіне прайшоў у вучобе на падрыхтоўчым аддзяленні Інстытута замежных моў, але потым Амран паступіў на факультэт журналістыкі БДУ, жыў у «двойцы» — універсітэцкім інтэрнаце № 2, што на Кастрычніцкай, 2.

— На радзіме больш спатрэбілася б якая-небудзь сельскагаспадарчая спецыяльнасць, — прызнаецца Амран, — аднак мяне цікавіла менавіта журналістыка: уплыў публіцыстыкі Эрнэста Хемінгуэя, Джона Рыда, Арыяны Фалачы.

Як і ўсе студэнты журфака, Амран праходзіў практыку ў СМІ. Яго публікацыі, часцей за ўсё прысвечаныя культуры, з'яўляліся на старонках «Вячэрняга Мінска» і газеты БДУ (цяпер яна завецца «Універсітэт»). Аднак з-за моўнага бар'ера кар'еры ў беларускай журналістыцы ў Амрана не атрымалася — зараз ён працуе менеджарам на іранскай фірме, якая займаецца транспарціроўкай прадукцыі Ірана ў Беларусь і наадварот.

Амрана, як інтэграванага ў жыццё нашай краіны іранца, не можа не радаваць умацаванне сувязяў паміж дзвюма блізкімі для яго краінамі. У абодвух народаў ёсць шмат агульнага, і разам з тым ім ёсць чаму павучыцца адзін у аднаго:

— Іран — шматканфесійная краіна (тут пражываюць мусульмане шыіцкага толку, апалагеты зараастрызму, прыхільнікі разнастайных накірункаў хрысціянства), гэта садзейнічала фарміраванню ў нацыянальным характары цярпімасці да прадстаўнікоў розных рэлігійных вераванняў.



Верацярпімасць уласціва і беларусам, яшчэ адна іх адметная рыса — надзвычайнае працалюбства. У супрацоўніцтве з беларусамі іранцы маглі б развіваць тыя сферы навукі і вытворчасці, якія ў Іране не такія прагрэсіўныя. Калі разглядаць іх узаемадзеянне ў палітычным ракурсе, то варта адзначыць, што збліжэнне такіх краін, як Беларусь і Іран, вядзе да фарміравання шматпалярнага свету, што проста неабходна ў сучасных умовах. А ў нацыянальным характары іранцаў ёсць такая цікавая адметнасць: застаючыся патрыётамі, яны вельмі кантактныя і ўспрымальныя ў адносінах да іншых культур, увогуле да ўсяго новага, незнаёмага. У іх атрымліваецца захоўваць нацыянальную самабытнасць і адначасова ўзбагачаць сваю культуру запазычаннямі з другіх культур. Так склалася гістарычна: Персія спакон вякоў была мастом паміж Усходам і Захадам.

Застаўшыся грамадзянінам Ірана, Амран пражыў у Беларусі ажно 20 гадоў:

— Беларусь стала маёй другой радзімай. Я ўнёс свой уклад у збліжэнне Ірана і Беларусі: у мяне шмат знаёмых беларусаў, і для іх я з'яўляюся ўвасабленнем Ірана. Паверце, я раблю ўсё для таго, каб вобраз маёй краіны быў як мага лепшым. Іранец па сваёй натуры, я ў пэўнай ступені стаў беларусам. Цяпер мне цяжка ўявіць сябе без тутэйшага жыцця — стабільнага, спакойнага, — жыцця, якое цячэ павольна, роўна, без экстрыму і непрадказальнасці. Я баюся згубіць гэты спакой, з'ехаўшы адсюль: мне давядзецца прызвычайвацца да новага для мяне Ірана. Аднак чалавек прызвычайваецца да ўсяго, трэба толькі перасіліць сваю боязь. У наступным годзе планую з'ездзіць у Іран.

Сярод праблем бежанцаў Амран узгадаў адсутнасць кваліфікаванай дапамогі для накіравання на працаўладкаванне і азнаямлення з мясцовым заканадаўствам, якое так неабходна таму, хто толькі што прыбыў у чужую краіну.

Шмат чаго змянілася за гэтыя 20 гадоў: палітычная абстаноўка ў Іране ды і погляды самога Амрана Хасейнпура. Ён і літаратуру іншую стаў чытаць: апошнім часам звяртаецца ўсе больш да філосафаў (працы Ніцшэ, Юнга, Шапенгаўэра). Нязменным застаўся толькі боль, які не сціхне ніколі... Гэты боль адчуваюць усе бежанцы, але ім нехапае не нашага жалю — хутчэй павагі. У нашых сілах зрабіць так, каб родная нам Беларусь не была для іх чужой.

Ала МАЧАЛАВА.

Каварства раку — у яго скрытасці

16 СНЕЖНЯ Ў МІНСКУ ПРОЙДЗЕ АКЦЫЯ «МІНЧАНЕ СУПРАЦЬ РАКУ»

У ёй возьмуць удзел калектывы медыцынскіх работнікаў Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансэра, гарадскіх эндаскапічнага і дыягнастычнага цэнтраў, цэнтра здароўя. Мэта акцыі — засяродзіць увагу людзей на своечасовай прафілактыцы анказахворванняў, ранняй дыягностыцы хваробы.

Праблемы раку сёння стаяць вельмі востра. Пасля сардэчна-сасудзістых захворванняў смяротнасць ад злаякасных новаўтварэнняў займае другое месца. І сталічныя медыкі невыпадкова б'юць трывогу. Як адзначыў галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансэра Зігмунд Гедрэвіч, на працягу многіх гадоў у Мінску назіраецца рост анкалагічнай захворваемасці. Яе штогадовы прырост складае 3,7 працэнта, што ў паўтара раза вышэй, чым у самай забруджанай радыенуклідамі Гомельскай вобласці. Вядучае месца займае рак скуры, лёгкага, страўніка. Пяцігадовая выжывальнасць пры злаякаснай пухліне не перавышае 50 працэнтаў, а гэта значыць, што кожны другі пацыент з такім дыягназам гіне.

Небяспека раку — у яго каварстве, заўважае З. Гедрэвіч, хвароба працякае скрыта. Практычна 3/4 пухліннай масы да праяўлення клінічных сімптомаў расце непрыкметна. Гэта можа цягнуцца 10—15 гадоў. Таму асноўная маса пацыентаў прыходзіць да спецыялістаў дастаткова позна. Ці можна выявіць злаякаснае новаўтварэнне раней? Можна, але для гэтага трэба ведаць клінічныя сімптомы пухліны і тыя сімптомы, якія ёй спадарожнічаюць. Бо часцей за ўсё рак узнікае не на пустым месцы, а на фоне перадпухлінных захворванняў. Самі пацыенты рэдка звяртаюць увагу на гэта або няправільна інтэрпрэтуюць змяненні, якія адбываюцца ў арганізме. Толькі спецыялісты могуць вызначыць, наколькі высокая рызыка стаць ахвярай хваробы.

— Мы хочам у ходзе акцыі, — гаворыць З. Гедрэвіч, — у першую чаргу выявіць перадпухлінныя захворванні і своечасова іх саніраваць, а таксама дыягнаставаць злаякасныя пухліны ў людзей, якія яшчэ не звярталіся да нас. Для гэтага будуць працаваць спецыялісты дыягнастычнага цэнтра, цэнтральных раённых паліклінік, гарадскога анкадыспансэра. Калі яны пацвердзяць наяўнасць у арганізме пацыента нейкіх падазроных працэсаў, то чалавеку будзе праведзена больш паглыбленае даследаванне. Чым раней выяўлена захворванне, тым вышэйшая выжывальнасць. Пры першай і другой стадыі раку гэтыя шанцы ўзрастаюць прыкладна ў 2—2,5 раза.

Вольга ШАЎКО.

ДПС не жартуе

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион по продаже обращенной в доход государства незавершенной строительством производственной базы (Борисовский р-н, д. Углы), в том числе: АБК, ремонтная мастерская, подстанция, котельная, нефтебаза, бензозаправочный пункт, канализация, ж/б забор. Площадь зем. участка – 5,3054 га. Начальная цена снижена на 20% и составляет – 679 276 160 бел. руб. Полное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 26.11.2005 г. Аукцион состоится 29.12.2006 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 28.12.2006 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактные телефоны: (8017) 2246134, (80177) 734049.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

36,6°

КАЛІ СТУПНЯ ПЛОСКАЯ...

Усё жыццё цела чалавека падтрымліваюць дзве невялікія па плошчы «апоры» — яго ступні. Яны ж забяспечваюць рух і амартызацыю. Добра, калі гэты механізм «працуе» бездакорна. Аднак адна з самых распаўсюджаных дэфармацый ступняў — плоскаступнёвасць. Пра асаблівасці гэтай паталогіі мы гутарым з кандыдатам медыцынскіх навук, дацэнтам кафедры траўматалогіі і артапедыі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Яўгенам МІХНОВІЧАМ.

— Трэба сказаць, што выдзяляюцца тры віды плоскаступнёвасці: падоўжаная, папярочная і камбінаваная. Кожны з іх характарызуецца пэўнымі прыкметамі. Пры падоўжанай плоскаступнёвасці назіраецца выражанае зніжэнне вышыні падоўжанага зводу, і ступня крыху падаўжаецца. Пры цяжкай ступені ступня абапіраецца на плоскасць усёй сваёй паверхняй, і назіраецца яе адхіленне наверх. Такая дэфармацыя выклікае няправільныя нагрузкі і потым прыводзіць да артрозаў дробных суставаў, можа ўзнікнуць балявы сіндром і г.д.

Пры папярочнай плоскаступнёвасці адбываецца дэфармацыя пярэдняга аддзела ступні. Ён пашыраецца, пры гэтым нярэдка ўзнікае і дэфармацыя пальцаў ступні. А гэта перашкаджае чалавеку насіць нармальны абутак, магчымы боль і, безумоўна, навідавоку касметычны дэфект.

Самы цяжкі варыянт — камбінаваны, які ўключае прыкметы ўсіх дзвюх папярэдніх паталогій.

Плоскаступнёвасць — гэта не толькі праблема ступняў, але і ўсяго арганізма. Калі ступня плоская, то не працуе механізм амартызацыі і нагрузкі, якія ўзнікаюць пры бегу, хадзьбе, не гасяцца, а з дня ў дзень перадаюцца на вышэйляжачыя аддзелы чалавечага шкілета. Таму ў людзей з гэтай паталогіяй даволі высокі працэнт артрозаў галёнаступневых, каленных, тазасцёгнавых суставаў, у хворых парушаецца постаць, часцей сустракаецца скаліёз, узнікае галаўны боль.

Гэта немач шырока распаўсюджаная. Паводле статыстыкі, падоўжаную плоскаступнёвасць маюць 17—30 працэнтаў людзей. А папярочная пасля 20—25 гадоў сустракаецца больш чым у 50 працэнтаў жанчын.

— Якія прычыны спрыяюць развіццю плоскаступнёвасці?

— Па-першае, яна можа быць прыроджанай. Прычым сама па сабе паталогія ў спадчыну не перадаецца, а перадаецца такая яе асаблівасць, як слабасць звязачна-мышачнага апарата.

Па-другое, плоскаступнёвасць можа быць і набытай. На гэта ўплываюць тыя нагрузкі, якія адчувае ступня на працягу жыцця. У групе рызыкі тыя людзі, якія пераносяць вялікія цяжкасці ці з-за прафесійных абавязкаў вымушаны доўгі час, не рухаючыся, стаяць на нагах. Павышаныя нагрузкі садзейнічаюць развіццю падоўжанай плоскаступнёвасці ў спартсменаў, напрыклад, канькабежцаў, цяжкаатлетаў.

Знешнім фактарам для развіцця папярочнай плоскаступнёвасці з дэфармацыяй пальцаў з'яўляецца мадэльны жаночы абутак на высокім абцасе з вузкім носам. Пры гэтым 80 працэнтаў нагрузкі ідзе на пярэдні аддзел ступні. Дарэчы, амаль у 100 працэнтаў балерын, якія з-за сваёй прафесійнай дзейнасці вымушаны доўгі час хадзіць на дыбачках, да 40 гадоў развіваецца папярочная плоскаступнёвасць з дэфармацыяй пальцаў.

— Якія раннія прыкметы паталогіі?

— Яны таксама розныя для падоўжанай і папярочнай плоскаступнёвасці. Бывае так, што яўнай дэфармацыі ступні яшчэ няма, а пачынае ўжо турбаваць боль у сярэднім аддзеле ступні, у мышцах галёнкі. Зусім верагодна, што пачынаецца развіццё падоўжанай плоскаступнёвасці. Яшчэ адной прыкметай з'яўляецца няправільны знос абутку ў вобласці абцаса. Пры плоскаступнёвасці ён зношваецца па ўнутранай паверхні. Што да папярочнай плоскаступнёвасці, то тут можа развіцца тэндэнцыя вельмі важная для жанчын, асабліва для тых, хто любіць насіць абутак на высокім абцасе з вузкім носам. Як правіла, у іх пачынаецца ўтварэнне мазоляў (натоптышаў) на падэшвеннай паверхні пярэдняга аддзела ступні. Калі ў жанчыны абсалютна роўныя пальцы, ступня пакуль яшчэ не шырокая, але ўжо ўтварыўся натоптыш, то гэта прыкмета таго, што ў наяўнасці папярочная плоскаступнёвасць.

— Як папярэдзіць развіццё плоскаступнёвасці, якія метады лячэння гэтай паталогіі існуюць сёння?

— На сёння падыходы да лячэння падоўжанай і папярочнай плоскаступнёвасці розныя. Для папярочнай асноўны метад — хірургічны. Як паказвае практыка, ён даволі эфектыўны. Хірургічным шляхам паспяхова можна выправіць дэфармацыі пальцаў ступні.

Для падоўжанай плоскаступнёвасці асноўным метадам лячэння і прафілактыкі з'яўляецца выключна кансерватыўны. Ён складаецца з некалькіх момантаў.

Па-першае, па магчымасці трэба зменшыць нагрузку на ступні. Напрыклад, калі работа звязана з васьмігадзінным стаяннем на нагах, лепш змяніць яе на сядзячую. Па-другое, рэкамендуюцца штодзённыя заняткі лячэбнай фізкультурай. Ёсць спецыяльны комплекс практыкаванняў, накіраваных на ўмацаванне мышцаў галёнкі. І па-трэцяе, варта насіць артапедычныя сцелькі, якія бываюць лячэбныя і прафілактычныя. Прафілактычныя сцелькі паказаны пры цяжарнасці, тым людзям, у якіх ідуць гарманальныя працэсы старэння, жанчынам падчас менапаўзы.

У плане прафілактыкі таму, у каго ёсць схільнасць да развіцця плоскаступнёвасці, нядрэнна мець дома дыванок з «шыпамі». На ім трэба пастаяць 10—15 хвілін у дзень. Сэнс у тым, што, калі чалавек становіцца на гэты дыванок, рэфлекторна раздражняецца падэшвенная паверхня ступні і, міма вашай волі, гэтае раздражненне прыводзіць да таго, што мышцы галёнкі прыходзяць у тонус і пачынаюць падтрымліваць ступні. А летам, напрыклад, добра пахадзіць з паўгадзіны басанож па няроўнай паверхні: пяску, траве, гальцы. Аднак у той жа час хвораму з плоскаступнёвасцю не рэкамендуецца доўгі час хадзіць басанож па роўнай паверхні.

Гутарыла Вольга ШАЎКО.

ЛОДКА

Майстар-лодачнік з вёскі Какорыца Драгічынскага раёна Іван Зіновіч з унукамі Аляксеем і Святланай.

Фота Анатоля КІШЧУКА.

НА гербе маіх родных Пастаў на блакітным фоне рыбацкая сетка і тры залатыя рыбкі. Гэта гістарычна абгрунтавана. У межах цяперашняга райцэнтра на беразе Задзеўскага возера выяўлена паселішча, якое датуецца III—II тысячагоддзямі да нашай эры. Чым маглі займацца старажытныя людзі на берагах шматлікіх азёр і рэк гэтага марэннага краю? Зразумела, і рыбалоўствам у тым ліку. У летапісную пару паселішча мела назву Пасаднік, было своеасаблівым заходнім фарпастом Полацкай зямлі. Рыбалоўства не магло тут не развівацца, набываючы ўсё больш сучасныя формы. Больш за тое, калі мы гаворым пра славуты шлях «з варагаў у грэкі», то маем на ўвазе найперш шлях у нашай краіне цераз Дзвіну і Днепр. Але ж у той час існавала і шмат іншых шляхоў, менш вядомых, якія таксама злучалі — праз рэкі і азёры — паасобныя землі нашай Бацькаўшчыны, служылі іншаземным гасцям. Адзін з такіх забытых шляхоў знаходзіўся ў нашым паўночна-заходнім краі і праходзіў па рачных сістэмах Дзвіны, Дзісны, Мядзелкі, Нарачанкі і Вілii. Паэт і краязнаўца Ігар Пракаповіч піша: « У гістарычных дакументах ён (шлях) ускосна згадваецца пад 1579 годам, калі кароль Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый ладзіў ваенную экспедыцыю супраць маскоўскага цара Івана Жахлівага, войскі якога захапілі тады горад Полацк. Паводле крыніц, па загаду караля ў Паставах гарматы былі пагружаны на плыты і па Мядзелцы і Дзісне перапраўлены ў Полацк. Можна меркаваць, што ваяводы Кароны і ВКЛ, прымаючы рашэнне аб ваеннай экспедыцыі, толькі скарысталі даўно вядомую і дзейсную водную сістэму».

Такі крыху велікаваты гістарычны экскурс зроблены, каб пачаць размову пра лодкі. У старажытнасці чалавеку неабходна было апынуцца не ў вадзе, а на вадзе. Каб рыбу лепш здабываць, каб праз глыбокую раку перабрацца, каб на востраве схавацца пасярод возера ад звера ці іншага ворага. А што ёсць пад рукой? Дрэва, так што спачатку адно бярно, а потым і плыт былі яго прасцейшымі лодкамі. А потым дадумаўся чалавек выдзеўбці вялікае бярно знутры — атрымліваецца і лягчэй, а калі яшчэ вясло, то і зручней плаваць. Як толькі не называліся такія лодкі на Беларусі: камяга, дуб, дубіца, карыта, даўбянка, калдуб. А найчасцей човен. Вёрткі ён быў, нездарма ж у ткацкай справе снуе таксама чаўнок, але ненадзейны. Зноў жа нездарма некаторыя лодкі так і называлі — душагубкі.

Потым з'явіліся дашчаныя лодкі, абшываныкі — напачатку іх не збівалі, а сшывалі спецыяльнымі віцамі. Самыя большыя судны, якія плавалі па беларускіх рэках і азёрах — ладдзі, віціны, шкунды, байдакі, лайбы, баркі, берліны, паромы. Ладдзі, якія якраз і выкарыстоўвалі падарожнікі з «варагаў у грэкі», умяшчалі і да ста чалавек. А стругі на Заходняй Дзвіне былі пласкадоннымі, без ветразя, але ж да сарака метраў даўжыні, дзесяці — шырыні, умяшчалі паўтары тоны грузу. Некалі яшчэ падлеткамі, ныраючы ў воды Мядзелкі, раскопваючы яе берагі, мы знаходзілі кавалкі нейкіх драўляных пабудоў. Як тлумачылі дарослыя, гэта былі рэшткі прыстаняў, якія стаялі некалі на досыць паўнаводнай рацэ. Сёння Мядзелка зусім абмялела, толькі турыстычную байдарку і прыме. Але ж некалі была водным шляхам. Яшчэ ў пачатку XX стагоддзя з нашых мясцін сплаўлялі лес па Дзісне, а потым па Заходняй Дзвіне аж да Рыгі. Па малых рэчках яго сплаўлялі россыпам, а па вялікіх — плытамі. У плыту бывала 300—500 калод, 10—20 плытоў складалі гонку ці сотню. І на кожнай гонцы — грамада плытнікаў на чале з дубавіком або рытманам. На плыце ж і хатка з печкай, дзе гатуюць ежу. Няма цяпер гэтай прафесіі і гэткіх майстроў. А вось бёрны, патанулыя ў Дзісне, сустракаюцца.

І ўсё-такі найбольш пры нашай шматлікай, але невялікай воднасці выкарыстоўвалі беларусы маленькія лодкі, найчасцей з адным вяслом ці двума вёсламі ва ўключынах. Уладзімір Караткевіч любіў ваду і лодку. Ёсць нямала здымкаў, дзе ён за вёсламі. А ўспомнім яго творы: «Ладдзя роспачы», «Паром на бурнай рацэ»...

Як рыбаку, а ў маладыя гады крыху і браканьеру, мне шмат даводзілася пабачыць лодак, шмат паплаваць то з шастом, то з вяслом, а то з двума вёсламі. Некалькі разоў закідваў невад разам з брыгадай прафесійных рыбакоў, якія працавалі ў Пастаўскім раёне ад нарачанскага рыбгаса. Сапраўдны невад — рэч сур'ёзная. Тут патрабуецца нямала рук. Каб не быць проста назіральнікам, напрошваўся памагатым на ўсю ноч. За ноч гэты вялікі невад толькі раз і закідваецца, робіцца адна тоня. Вывозіцца ён на сярэдзіну возера ці туды, дзе ёсць рыбныя ямы, на дзвюх вялікіх лодках ужо ў глыбокай цемры. Брыгадзір арыентуецца па толькі яму вядомых арыенцірах і па колькасці грабкоў вёслаў. Напрыклад, ён ведае, што каб закінуць невад у пэўным месцы, трэба ад берага на вядомы арыенцір зрабіць пяцьсот грабкоў вёсламі. І вось прыплылі на месца, скінулі ў ваду карму. І лодкі пакрысе пачынаюць разыходзіцца, ахопліваць сеткаю рыбнае месца. Пакуль дабраліся да берага, пакуль калаўротамі, устаноўленымі на лодках, выцягнулі спачатку трасы, а потым пачалі цягнуць сетку — развіднела. І вось, урэшце, пры сонцы, фініш — на прыбрэжны пясок упаўзае карма невада, паўнюсенькая рыбай. Сотні і сотні кілаграмаў. Трэба грузіць на машыну, адпраўляць у краму і на рыбзавод. А рукі ныюць і ад вёслаў, і ад калаўрота.

Рукі ад вёслаў нылі і вярэдзіліся яшчэ не раз. Перад службай у арміі тузін хлапцоў з Пастаў, сярод іх і я, нечакана трапілі на паўгода на вучобу ў Віцебскі марскі клуб. Рыхтавалі там спецыялістаў для службы на флоце, з нас менавіта дызелістаў. А які ж флот без вады? Рэгулярнымі былі заняткі па грэбле на ялах. Гэта такія шлюпкі, дзе чатыры чалавекі сядзяць на вёслах, а пяты — на рулі. А надвор'е лістападаўскае, ужо і са сняжком, а па Дзвіне ідзе добрая хваля. Трэніраваліся да крывавых мазалёў, але разам з пасведчаннямі дызелістаў атрымалі і коркі спартсменаў-разраднікаў па гэтай самай грэблі. Праўда, уся наша пастаўская група па невядомых прычынах трапіла не на флот, а ў пяхоту.

Рыхтуючы гэты артыкул, усё ўспамінаў: а ці напісаў я калі радкі пра лодку, вёслы і г.д. Успомніў. І зноў жа пра рыбалку невадам, пра закід яго ў глыбокай восені.

Якая тоня ў рэшце дня:
Ледзь прабіваюць лодкі лёд
Да берага. Наскрозь праняў
Спачатку бы гарачы пот.
Якая тоня ў рэшце дня:
Звініць нібы лядак вясло,
Рукаў ватоўкі набрыняў,
І рукі немаччу звяло...

Сёння ў Паставах няма ўжо афіцыйнай рыбалавецкай брыгады, засталася толькі адна, здаецца, і на Нарачы, самым большым нашым возеры-моры. А вось лодкі на Нарачы адметныя. Ужо не пласкадонкі — тут жа і хвалі бываюць — лёгкія, з пластыку, умясціць могуць цэлую кампанію. І веславаць на іх няцяжка, бо вёслы спецыяльныя, доўгія і лапаты ў іх нібыта лыжкі. Чарпануў, загроб — пакаціла. Увогуле, Нарач без рыбацкага чаўна, без водных лыжаў, без паруса яхты ўявіць сабе цяжка. Некалі ў рэдакцыю райгазеты прынёс верш ужо немалады чалавек, Яўстафій Абрамовіч. Прачытаў яго просценькія нібыта радкі — і душу заняло. Было ў паэта потым нямала твораў, а гэты ўражвае па-ранейшаму. Ну як ім не парадаваць чытача?

Нібы агеньчыкі гарачыя
На сіні жнівеньскай вады
Цвітуць на Нарачы гарлачыкі —
Мае юнацкія гады.
Да гэтых кветак,
што дзівоснымі
З тых непаўторных дзён заву,
У светлых снах махаю вёсламі
І ўсё ніяк не даплыву.
Раней здавалася
ўсё простым мне.
З табой да іх я веславаў.
І жоўты колер —
колер ростані —
Мяне зусім не хваляваў.
Не супакоіць памяць лекамі.
І я, на шчасце ці бяду,
Праз колькі часу зноў, як некалі,
Знаёмым берагам іду.
Хвалюе сэрца песня родная,
Дзяўчына, на цябе падобная,
Хлапцу напіцца падае.
А мне у смелых марах бачыцца:
Ізноў з табой мы у чаўне.
І — нібы з келіха — з гарлачыка
Ты поіш весела мяне.

Алесь КАСЦЕНЬ.
Віцебская вобласць.

Простыя рэчы

36,6°

НЕСПРЫЯЛЬНАЕ НАДВОР'Е ЎПЛЫВАЕ НА ЗДАРОЎЕ

Эксперты рэспубліканскага гідраметэаралагічнага цэнтра высветлілі, што зараз, у эпоху глабальнага пацяплення клімату народныя прыкметы і календары не прадказваюць рэальнае надвор'е ўвогуле.

Уплыў надвор'я на чалавечы арганізм шматгранны. Галоўны фактар — **тэмпература паветра**, ад якой залежыць глыбіня і частата дыхання, хуткасць цыркуляцыі крыві, характар кроваўтварэння, забеспячэнне кіслародам клетак, водны абмен і работа мышцаў. Тэмпература паветра ад 15 да 25 градусаў цяпла для большасці здаровых людзей складае зону камфорту. Пры больш высокіх тэмпературах можа назірацца падаўленне жыццёвых функцый арганізма, у выніку чаго чалавек даволі лёгка «падчэпліваe» інфекцыйныя захворванні. Пры істотным зніжэнні тэмпературы спачатку пачынаюць мерзнуць ногі і адбываецца пераахалоджанне слізістых абалонак дыхальных шляхоў, пасля чаго на нас робяць набегі прастудныя захворванні.

З рэзкім павелічэннем **вільготнасці паветра** чалавечы арганізм робіцца больш схільным для захворванняў лёгкіх і нырак. Сухое паветра выклікае раздражненне дыхальных шляхоў, кашаль, задышку, агульнае ўзбуджэнне, галаўныя болі і бяссонніцу. Камфортныя ўмовы для чалавека складаюцца пры сярэдняй вільготнасці паветра ў межах 50 працэнтаў і адсутнасць рэзкіх яе ваганняў. На тэрыторыі Беларусі — павышаная вільготнасць, а найбольш спрыяльныя ўмовы для людзей па рэжыму аднаснай вільготнасці назіраюцца ў вясенне-летні перыяд, што адпавядае маю—жніўню.

Атмасферны ціск рэгулюе паступленне кіслароду ў паветра. Паніжэнне атмасфернага ціску за кароткі тэрмін выклікае парушэнне дыхальнага працэсу, зніжэнне лёгачнага і тканкавага газаабмену, абядненне крыві і тканак кіслародам, павялічвае верагоднасць сардэчна-сасудзістых захворванняў. У нашай краіне ў большасці рэгіёнаў атмасферны ціск на працягу некалькіх сутак змяняецца плаўна.

Забруджванне паветра робіць яго пераносчыкам хваробатворных бактэрый і вірусаў, актыўнасць і жыццяздольнасць якіх залежыць ад тэмпературы і вільготнасці паветра. Актуальнымі паказчыкі забруджвання атмасфернага паветра з'яўляюцца менавіта сёлета, калі ў снежні трымаецца вельмі вільготнае і адносна цёплае надвор'е. Вядома, што ў сонечнае марознае надвор'е хваробатворныя бактэрыі і вірусы хутка гінуць.

Асобую ролю ў самаадчуванні чалавека адыгрывае і **стан магнітнага поля Зямлі**, на якое ўплывае сонечная актыўнасць. У наступных нумарах мы прапануем вам практычныя рэкамендацыі ад спецыялістаў дэпартамента па гідраметэаралогіі як паводзіць сябе падчас навальніцы, урагану, паводкі, лясных і тарфяных пажараў, замаразкаў і рэзкіх зменаў надвор'я.

Сяргей КУРКАЧ.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.20	15.47	7.27
Віцебск —	8.18	15.30	7.12
Магілёў —	8.11	15.38	7.27
Гомель —	7.59	15.43	7.44
Гродна —	8.34	16.04	7.30
Брэст —	8.26	16.13	7.47

Месяц

Апошняя квадра 12—19 снежня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Навума, Філарэта;*
К. *Альфрэда, Ісідара, Яна.*

Надвор'е на заўтра



…у суседзяў

ВАРШАВА	+6 — +8 °С	МАСКВА	+5 — +7 °С
ВІЛЬНЮС	+5 — +7 °С	РЫГА	+8 — +10 °С
КІЕЎ	+5 — +7 °С	С-ПЕЦЯРБУРГ	+6 — +8 °С

Без ападкаў

Дзве даты

14 снежня

1960 год — шэраг еўрапейскіх краін падпісалі дагавор аб стварэнні Арганізацыі Еўрапейскага Эканамічнага Супрацоўніцтва (ЕЭС).

1812 год — рэшткі разбітай французскай арміі фарсіравалі Нёман.

Цытата дня:

«Жанчыны ведаюць толькі адзін спосаб нас ашчаслівіць і трыццаць тысяч спосабаў зрабіць нас нясчаснымі».

Генрых Гейнэ (1797—1856), класік нямецкай літаратуры.

Усміхнёмся!

— Дзе працуе ваш муж?

— Ужо трэці месяц на лікёра-гарэлачным заводзе.

— І яму там падабаецца?

— Не ведаю. Ён яшчэ дадому не прыходзіў.

☺

Любімы кот Арнольда Шварцэнегера меціць у крэсла губернатара.

☺

— Ты не хацеў бы правесці водпуск у Англіі?

— Жаданне ёсць, але гэты левабаковы рух мне вельмі не падабаецца! Я тут днямі паспрабаваў на нашым праспекце — не, гэта не для мяне!

☺

Допінг — гэта калі заўважылі. А пакуль не заўважылі, гэта вітаміны!

☺

— Тата, я замуж не буду выходзіць, я з вамі жыць буду...

— Не ўздумай пагражаць бацьку!

Спорт-тайм

Экстрэмальны скачок

Фрыстайл нездарма адносяць да аднаго з самых экстрэмальных відаў спорту. Так, беларус Дзмітрый Рак да гэтага часу знаходзіцца ў непрытомнасці ў бальніцы Кітая, куды трапіў пасля таго, як атрымаў траўму ў час першага этапу Кубка свету (няўдала прызямліўся пасля скачка). Медыкі канстатавалі ў спартсмена кровазліццё ў мозг.

Шабанаў не ўпэўнены ў першым голе

Нацыянальная зборная Беларусі па хакею з шайбай уступіла ў таварыскай сустрэчы віцэ-чэмпіёнам свету, чэхам — 0:2 (прапусціла ў першым і другім перыядах). Нягледзячы на тое, што Сяргей Шабанаў не змог захаваць беларускія вароты сухімі, галкіпера прызналі лепшым іграком матча. Дарэчы, пасля паядынку варатар прызнаўся, што сумняваецца наконт першага гола. Паводле яго слоў, шайба, быццам бы, затрымалася пад яго шчытком. Галоўны трэнер каманды Курт Фрэйзер, нягледзячы на пройгрыш, у цэлым застаўся задаволены гульнёй сваіх хакеістаў. Асабліва настаўнік вызначыў Сяргея Шабанава і заўважыў, што беларусы прайгралі, бо ў камандзе шмат маладых ігракоў, якія толькі набіраюцца вопыту, каб спаборнічаць з такім моцным сапернікам.

Знайшлі Шуканава?

Кіраваць футбалістамі брэсцкага «Дынама» ў будучым сезоне, хутчэй за ўсё, будзе Юрый Шуканаў, які два гады таму зрабіў мінскіх «бела-блакітных» чэмпіёнамі Беларусі пасля сямігадовага перапынку. Нагадаем, што ў апошнім сезоне каманду з горада над Бугам узначальваў Сяргей Бароўскі.

«Рэджыну» пашкадавалі

Арбітражны суд Алімпійскага камітэта Італіі змякчыў пакаранне футбольнаму клубу «Рэджына», які быў замешаны ў дагаворных матчах. Нагадаем, што каманду першапачаткова аштрафавалі на 15 ачкоў, але зараз «віноўніца» атрымала 4 дадатковыя ачкі і таму паднялася ў турнірнай табліцы серыі «А» на 19-е месца. Пасля 15 тураў у «Рэджыны» 9 ачкоў.

37 кілаграмаў футбольнай гісторыі



Самы папулярны англійскі клуб «Манчэстар Юнайтэд» выпусціў кнігу вагой...37 кілаграмаў. У выданні, што распавядае аб гісторыі каманды, 850 старонак, на якіх размешчаны дзве тысячы фотаздымкаў. Кожны экзэмпляр (тыраж 9,5 тысячы) падпісаны трэнерам Алексам Фергюсанам і легендарным іграком Бобі Чарльтанам. Кошт кнігі — амаль 6 тысяч долараў.

Лепшыя трэнеры

Галоўны трэнер футбольнай каманды «Фіярэнціна» прызнаны сваімі калегамі лепшым клубным настаўнікам года ў Італіі: Чэзарэ Прандэлі атрымаў прыз «Залатая лаўка». Згодна з апытаннем журналістаў часопісаў «Матч» і «ТОП-футбол», лепшым трэнерам Украіны стаў Алег Блахін, які ўзначальвае нацыянальную зборную.

Крымінал

«ПАЛЯЎНІЧЫЯ» ЗА... ДАМАФОНАМІ

У Маладзечне невядомыя зладзюжкі прыахвоціліся да крадзяжу панэляў дамафонаў з дзвярэй дамоў.

Зараз супрацоўнікі міліцыі расследуюць дзве падобныя справы, калі пасля ночы ў дамах «знікалі» дамафоны. Так, паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, у адным з дамоў па вуліцы Дудко невядомы знёс панэль дамафона, у выніку чаго жыллёва-будаўнічаму кааператыву нанесены ўрон больш як на 350 тысяч рублёў. Падобнаму «набегу» падвергся і дом на вуліцы Гасцінец, сума ўрону дакладна такая ж. Праваахоўнікі цяпер высвятляюць асобы незвычайных «паляўнічых».

Ігар ГРЫШЫН.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Ірына Самулевіч, тэл. 287-18-74 № 41 (217)

Пытанне — адказ

У рэдакцыю паступіла пытанне ад Мікалая Канстанцінавіча з Пінска, які пытаецца, «чаму ў вінаграду былі дробныя гронкі і ягады, што трэба рабіць у такім выпадку і ці праўда, што найбольш карысны вінаград жоўтага колеру».

Наконт першай часткі пытання. У адрозненне ад іншых пладовых культур, памер ягады і гронкі ў вінаграду можа мяняцца. Прычынай таму можа быць, па-першае, моцная перагрузка куста ўраджаем і парасткамі, па-другое, расліна могуць падмерзці зімой, па-трэцяе, пэўны год можа быць не вельмі ўдалым для вінаграду.

Калі куст перагружаны, у перыяд да цвіцення неабходна выдаліць частку зачаткавых гронак. Тыя, што засталіся, будуць значна буйнейшымі.

Што датычыцца афарбоўкі ягады, то яна можа быць самай разнастайнай. Смак пладоў мала ад гэтага залежыць. Часцей за ўсё афарбаваная бывае толькі скурка, а мякаць застаецца бясколернай. Гатункі вінаграду з афарбаванай мякаццю на смак, як правіла, больш даўкія. Яны лічацца больш карыснымі, чым бясколерныя гатункі.

Пазбавімся ад старых дрэў

Зіма, асабліва калі яна маласнежная, цалкам можа падысці для выкарчоўвання старых, непатрэбных пладовых дрэў. Іх уборка ў гэты час не нанясе ўрону пасадкам суніц, ягадных кустоў, іншых шматгадовых раслін, якія знаходзяцца побач і ў гэты час схаваныя пад снегам.

Пажадана планаваць гэту аперацыю яшчэ да таго, калі выпадзе снег, і падкапаць дрэва так, каб знайсці каранёвую шыйку і частку верхніх каранёў. Пры выкарчоўванні трэба адгрэбці снег ад дрэва, вызначыць, куды дрэва павінна паваліцца. Каб выключыць верагоднасць няшчаснага выпадку, дрэва трэба надпіліць з таго боку, куды яно паваліцца, спілаваць ніжнія галінкі, раскласці іх на месцы мяркуемага падзення дрэва для змякчэння ўдару. Толькі пасля гэтага з процілеглага ад запілу боку прыступіць да спілоўвання дрэва.

Першыя памочнікі

Неабходна імкнуцца да таго, каб праца, якая затрачваецца на ўчастку, прыносіла найлепшыя вынікі. А гэта значыць, трэба зрабіць усё для таго, каб стварыць найлепшыя ўмовы для росту і развіцця раслін. Раслінам патрабуюцца не толькі святло, вільгаць і цяпло, але і пажыўныя рэчывы ў вызначанай іх колькасці. Толькі пры спалучэнні гэтых фактараў можна вырасціць здаровыя расліны, а таксама атрымаць высокі ўраджай добрай якасці.

Пажыўныя рэчывы, якіх не хапае раслінам, трэба ўносіць у глебу ў выглядзе ўгнаенняў у аптымальныя тэрміны з улікам патрэбнасці ў іх. Але мала проста ўносіць угнаенні, трэба імкнуцца да стварэння экалагічна чыстай прадукцыі. Як гэтага дасягнуць?

Попел — выдатнае комплекснае ўгнаенне. У ім змяшчаецца каля 30 каштоўных элементаў (магній, жалеза, калій, кальцый і інш.). Попел зніжае кіслотнасць глебы, павышае зімаўстойлівасць пасадак, робіць арганіку больш даступнай для раслін. Эфектыўнасць попелу павялічваецца, калі выкарыстоўваць яго разам з торфам, кампостам ці перагноем. А вось змешваць з азотнымі ўгнаеннямі, суперфасфатам, гноем і птушыным памётам не трэба, бо ў такім выпадку губляецца амаль палова азоту.

Попел у якасці ўгнаення трэба выкарыстоўваць толькі драўнінны. Вугальны попел не прынясе карысці. Дапускаецца ўносіць у глебу сажу, але яе ўздзеянне на расліны пакуль да канца не вывучана.

Попел можна распыляць над усім участкам, але лепш дадаваць у лункі непасрэдна перад сяўбой, старанна змешваючы з зямлёй. Добра адклікаюцца на ўнясенне попелу такія культуры, як агуркі, цвятная капуста, маліна, парэчкі, суніцы, вінаград і асабліва бульба.

Попел — гэта не толькі выдатная падкормка, але і лякарства ад такіх небяспечных хвароб, як чорная ножка, кіла і розныя гнілі.

Яечная шкарлупіна — унікальнае ўгнаенне. Больш за ўсё ў ёй, зразумела, кальцыю. Але яечная шкарлупіна, акрамя гэтага, змяшчае фосфар, магній, серу. Гэта лёгкадаступнае ўгнаенне зніжае кіслотнасць і павышае ўрадлівасць глебы. Уносяць яечную шкарлупіну ў глебу вясной, пад перакопку.

Збіраць і захоўваць яе лепш у папяровых пакетах, каб выпаралася вільгаць і не назапашваліся рэшткі бялку, якія выклікаюць непрыемны пах.

Марганцоўка — самы просты і эфектыўны сродак супраць шкоднікаў і хвароб раслін. Для намочвання насення часта выкарыстоўваюць перманганат калію. Ён не толькі прадэзінфіцыруе яго, але і забяспечыць пачатковым запасам марганцу. Марганцоўкай можна абеззаражваць глебу на градках, у парніку. Гэта выратоўвае таматы, перац, капусту ад чорнай ножкі. Марганцоўка — выдатны сродак і супраць фітафтарозу, спраўляецца яна і з мучністай расой, і з каранёвымі гнілямі.

Важнейшая частка глебы

Ад глебы напрамую залежыць якасць ураджаю. Ведаючы, якая глеба на ўчастку, можна ў межах пэўнай тэрыторыі адвесці для кожнай з культур найлепшае месца. Пры гэтым дапаможа акультурванне, г. зн. стварэнне структурнай глебы, якое забяспечвае аптымальныя водна-паветраныя ўмовы для раслін, дзейнасці мікраарганізмаў па пераўтварэнню арганічных рэчываў у даступныя для раслін мінеральныя злучэнні. І тут мае вялікае значэнне такое паняцце, як *гумус*.

Гумус — важнейшая частка арганічнага рэчыва глебы (перагной), у які ўваходзяць гумінавыя, растравыя, біялагічныя рэчывы і вітаміны. Чым больш гумусу, тым больш урадлівая глеба. У гумусе змяшчаецца 90 працэнтаў глебавага азоту, 80 працэнтаў серы, 60 працэнтаў фосфару. Пры гніенні гумусу і арганічных рэшткаў выдзяляецца шмат вугляkіслага газу, які служыць крыніцай вугляроднага харчавання раслін.

Гумус — універсальная сістэма, якая вызначае і рэгулюе ўзровень структуры, шчыльнасці і іншых фактараў, што садзейнічаюць росту ўрадлівасці глебы. Гумус павышае эфектыўнасць мінеральных угнаенняў, стварае запас пажыўных, фізіялагічна актыўных рэчываў, неабходных раслінам.

Крыніца гумусу ў глебе — арганічныя рэшткі раслін, мікраарганізмаў, жывёл. Павялічвае запас гумусу сістэматычнае ўнясенне арганічных угнаенняў, з якімі паступаюць у глебу ў значнай колькасці гатовыя гумусавыя рэчывы.

КВЕТКІ ЛЮБЯЦЬ МОХ

Мох, ці сфагнум — ідэальны субстрат для ўкаранення раслін, цудоўны антысептык і ўвільгатняльнік паветра. Гэта вельмі надзейны памочнік у вырошчванні кветак.

Сфагнум выкарыстоўваецца для ўкаранення чаранкоў і пры іншых формах вегетатыўнага размнажэння. Ён незаменны пры складанні дрэнажу, земляных сумесяў, як мульчыруючы слой, для ўвільгатнення паветра і ў дэкаратыўных мэтах.

Пры выкарыстанні вільготнага моху для размнажэння кветак у раслін хутчэй утвараюцца карані, яны дружна ідуць у рост і добра галінуюцца. Гэты метад асабліва эфектыўны для размнажэння так званых «цяжкіх» раслін, сцёблы якіх у вадзе загніваюць.

Пры перасадцы ў глебавы субстрат трэба пакінуць з карэнычыкамі частку моху, у якім яны ўкараняліся.

Можна паспрабаваць змяшаць мох са здробненым бярозавым вугалем — атрымаецца выдатны дрэнаж для вільгацелюбівых кветак, асабліва тых, якія аддаюць перавагу кіслым глебам. А можна абгарнуць у гэтых раслінах ніжнія паветраныя карані. Тым самым пасадзейнічаць іх развіццю і лёгкаму пранікненню ў зямлю. Гэта дасць кветцы дадатковае харчаванне.

У памяшканнях з цэнтральным ацяпленнем у зімовы час многія расліны пакутуюць ад перасыхання паветра. Тут мох можа аказаць неацэнную паслугу. Вазон з раслінамі трэба змясціць у другі вазон — большага памеру. Прастору паміж імі запоўніць мохам, які час ад часу трэба ўвільгатняць.

Сфагнум можна купіць у магазіне ці прагуляцца ў вольны час па лесе і назбіраць яго самім. Дома абавязкова неабходна яго абліць гарачай вадой. Такім чынам атрымаем цудоўны стэрыльны субстрат.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 36.281. Індэкс 63850. Зак. № 6938. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12